ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСЯХ КРАЎ ЛУЧАЙЦЕСЯ!

№ 148 (3256) Аўторак, 2-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, намаратар—619, кантора—731

Урэчская бібліятэка м. Горкага Инв. 2646

РАДЫЕ

Ў ГАДЗ. НОЧЫ:

ВАРШАВА, 1. Газэты паведамляюць, што на зьезьдзе закардонных палякаў будуць прысутні чаць дэлегацыі: ад ПАЗШ, Нямеччыны, Францыі, Бразыліі, Канады, Мэксікі, Аргэнтыны, Кітая, Чэха-Славакіі і Гапяндыі. Адносна дэлегацыі ад СССР — паведамленьне адсутнічае.

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.) На правядзеньне асеньняй пасеўнай кампаніі адпушчана больш як 500 тысяч рублёў. З паказанай сумы будзе патрачана 440 тысяч на машыназабесьпячэньне, 35 тысяч на куплю чыстагатункавага насеньня і 11 тысяч на дадатковае абсталяваньне сельска-гаспадарчых майстэрань

10-тысячная рабочая дэманстрацыя ў Бэрліне

Падрыхтоўка да міжнароднага антываеннага дня

БЭРЛІН, 29. Учора нямецкая кампартыя арганізавала ў Бэрліне рабочую дэманстрацыю, якая зьяўлялецца адказам на ўчарайшыя дэманстрацыі фашыстых. **У камуністычнай дэманстрацыі ўдзельнічала звыш 10 тысяч рабочых.** Дэманстрацыя праходзіла пад лёзунгам барацьбы супроць фашызму, супроць сацыял-дэмакратычных (меншавіцкіх) дапаможнікаў фашызму, супроць пагрозы вайны і за абарону СССР. Асабліва пратэставалі рабочыя супроць заявы сацыял-дэмакратычнага міністра ўнутраных спраў Зэвэрынга, што каалыцыйны ўрад будзе ўжываць, замест праваленага рэйхстагам закону аб ахове рэспублікі, 48 артыкул Вэймарскай канстытуцыі, які прадастаўляе яму дыктатарскія правы.

Камуністычная газэта «Ротэ Фанэ» піша, што ўчарайшая рабочая дэманстрацыя зьяўляецца магутнай падрыхтоўкай да нядыходзячых антываенных дэманстрацый ў дзень 1-га жніўня.

У гор. Брэслаўлі (паўднёва-усходняя Нямеччына) таксама адбылася масавая камуністычная дэманстрацыя. Паліцыя напала на дэманстрантаў з гумовымі дубінкамі і арыштавала некалькі з іх.

У гор. Касэлі (заходняя Нямеччына) начальнік паліцыі — сацыял-дэмакрат забараніў камуністычную дэманстрацыю. У Мюнхэне (паўднёвая Нямеччына) паліцыяй забаронен мітынг МОПР'у, на якім меркавалася прадэманстраваць фільм аб першамайскіх расстрэлах у Бэрліне.

БАЯВАЯ АДОЗВА РАБОЧЫХ ХЭМІЧНЫХ ЗАВОДАЎ

БЭРЛІН, 27. Прадстаўнікі рабочых буйнейшых нямецкіх хэмічных заводаў Леуна зьвярнуліся з адозвай да рабочых-хэмікаў усіх краін, заклікаючы іх да ўдзелу ў арганізацыі міжнароднага супроцьваеннага дня. Адозва прапануе рабочым-хэмікам дакладна сачыць за вытворчасьцю сродкаў хэмічнае вайны.

***

БЭРЛІН, 28. Раённая канфэрэнцыя фабзаўкомаў Тэмпэльгофу (аднаго з заводзкіх раёнаў Бэрліну) аднагалосна пастанавіла прыступіць да падрыхтоўкі к чырвонаму дню і абрала спэцыяльны камітэт для правядзеньня гэтае работы. У склад камітэту па падрыхтоўцы анты-імпэрыялістычнага дня—1-га жніўня ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх буйнейшых прадпрыемстваў раёну. Канфэрэнцыя вітала адозву Камінтэрну да дня 1-га жніўня.

***

ПАРЫЖ, 30. Унітарная фэдэрацыя саюзу швэйнікаў апублікавала адозву, у якой заклікае ўсіх швэйнікаў выканаць свой клясавы абавязак і прыняць удзел у дэманстрацыях 1-га жніўня. Адозва падкрэсьлівае, што капітал усіх краін вядзе жорсткае наступленьне супроць рабочае клясы і рыхтуе напад супроць СССР; у дзень 1-га жніўня міжнародны пралетарыят будзе дэманстраваць згуртаванымі радамі супроць прыгнёту капіталу і яго замыслаў.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ЛІСТОЎКІ СЯРОД АНГЕЛЬСКІХ МАТРОСАЎ

СТОКГОЛЬМ, 29. Нядаўна эскадра ангельскіх ваенных суднаў наведала Осло (сталіца Нарвэгіі). У час стаянкі эскадры нарвэгскія камсамольцы распаўсюджвалі сярод ангельскіх матросаў лістоўкі, якія заклікаюць іх прыняць удзел у дэманстрацыях 1 жніўня пад лёзунгам абароны СССР. Некалькі камсамольцаў арыштаваны.

Буржуазія распраўляецца

Дабраджэану зноў абвясьцілі галадоўку

ВЕНА, 28. Па вестках «Адэвэрул», Дабраджэану, які зноў абвясьціў галадоўку, адмовіўся нават ад вады, заяўляючы, што будзе працягваць галадоўку, пакуль не дасягне свайго вызваленьня.

Галадоўка індыйскіх рэвалюцыянэраў

ЛЁНДАН, 29. Лагорскі карэспандэнт «Таймс» паведамляе, што два індыйскіх рэвалюцыянэры, прысуджаныя нядаўна па справе аб выбуху ў індыйскім законадаўчым сходзе да бястэрміновае катаргі, ужо 14 дзень галадуюць, пратэстуючы супроць таго, што ім адмовілі ў рэжыме палітзьняволеных.

Зьцьверджаньне катаржнага прысуду над камуністымі Румыніі

ВЕНА, 27. Як паведамляе «Адэвэрул», румынскі апэляцыйны суд зацьвердзіў прысуд першае інстанцыі па справе Клаузэнбургскіх камуністых, засуджаных у лютым месяцы да турэмнага зьняволеньня ад 2 да 9 год за камуністычную дзейнасьць. Асуджаныя абскардзілі пастанову апэляцыйнага суду ў вышэйшы касацыйны суд, зазначаючы, што ў сувязі з нядаўна абвешчанай амністыяй, прыгавор першай інстанцыі павінен быць анулёваны. Слуханьне скаргі ў вышэйшым касацыйным судзе назначана на 3-га ліпеня.

Турма за зьнявагу агентаў паліцыі

ПАРЫЖ, 30. У парыскім папраўчым судзе (які разглядае справы без удзелу прысяжных засядацеляў) слухалася справа 5 грабароў, якія абвінавачваліся «у зьневажаньні агентаў паліцыі» у час маніфэстацыі парыскіх грабароў і дэмэнтшчыкаў, якая адбылася 24-га верасьня. Усе абвінавачаныя прысуджаны да турэмнага зьняволеньня на тэрміны ад 2 да 6 месяцаў.

Арышт камуністычнага рэдактара

ПАРЫЖ, 30. У Лілі арыштован рэдактар мясцовага органу кампартыі Блёндэль. Прычына арышту—надрукаваньне артыкулу з поваду трагічнае сьмерці рабочага, раздушанага аўтамабілем, у якім ехаў адзін з буйнейшых тэкстыльных фабрыкантаў лільскага раёну.

Новы збожжавы саўгас „Магнітны“

(У Р А Л)



У Троіцкай акрузе арганізован новы вялікі збожжавы саўгас «Магнітны», які мае 65.000 гектараў зямлі. Збожжавы саўгас прыступіць да засеву з восені бягучага году, зараз пачаты работы па заворваньні цаліны пад папар, ярыну і азімыя.

Саўгас ужо цяпер мае 32 трактары розных сыстэм.

Увесь абоз саўгасу механізаваны легкавымі і грузавымі аўтамабілямі.

На здымку: Група жанчын трактарыстак за працаю.

ТОЛЬКІ САВЕЦКІ САЮЗ—БАЦЬКАЎШЧЫНА ПРАЦОЎНЫХ ПАЛЯКАЎ

У выпадку нападу польскага фашызму на СССР працоўныя палякі ўсяго Саюзу дадуць рашучы адпор

(З рэзалюцыі канфэрэнцыі працоўных палякаў Менскае акругі)

Пазаўчора закончылася Менская Акруговая канфэрэнцыя працоўных палякаў. Мэта канфэрэнцыі — абраньне дэлегатаў на Усебеларускі зьезд працоўных палякаў. У працах зьезду прымала ўдзел 134 дэлегаты з рашаючым голасам і 250 гасьцей рабочых і сялян.

Канфэрэнцыя заслухала наступныя пытаньні: эканамічныя і культурныя дасягненьні працоўных палякаў і іх удзел у сацыялістычным будаўніцтве — дакладчык тав. **Віткоўскі.** Другім пытаньнем стояла інфармацыя адказнага сакратара Цэнтральнага Грамадзкага Камітэту БССР тав. **Кукелка** аб Варшаўскім зьезьдзе замежных палякаў. Па гэтых дакладах выступіла шмат дэлегатаў. **Прамоўцы ў сваіх выступленьнях аднадушна адзначалі, што бацькаўшчынай працоўных палякаў зьяўляецца Савецкі Саюз. — Польскія фашыстыя,** — адзначалі прамоўцы, — **памыляюцца, калі шукаюць падтрыманьня сярод працоўных палякаў БССР.** Выступалі на гэтых выступленьнях **з вялікім уздымам адзначалася, што толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту магчыма разьвіцьцё культуры і гаспадаркі ўсіх нацыянальнасьцяй.**

Па дакладу тав. **Віткоўскага** канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыю, у якой адзначаецца, што тэмп разьвіцьця нашае гаспадаркі перавышае ўсё, што да гэтага часу ведае гісторыя. — **Працоўныя палякі Савецкага Саюзу — гаворыцца ў рэзалюцыі, — прымалі, прымаюць і будуць прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, плячо ў плячо з рабочымі і сялянамі іншых нацыянальнасьцяй, працоўныя палякі будуць рэалізаваць нашу сацыялістычную пяцігодку, і ў выпадку ваеннага нападу польскага фашызму на СССР дадуць рашучы адпор.**

[illegible] акруговага грамадзкага камітэту канфэрэнцыя поўнасьцю адобрыла яго лінію і працу яго прызнала здавальняючай.

Сёньня адчыняецца Усебеларускі Зьезд працоўных палякаў

Сёньня, а 10 гадзіне раніцы ў клюбе Розы Люксэмбург адкрываецца ўсебеларускі зьезд працоўных палякаў для абраньня дэлегатаў на Варшаўскі Зьезд замежных палякаў. На гэты зьезд Менская акруговая канфэрэнцыя абрала 41 дэлегата.

ДА ЗЬЕЗДУ ЗАРУБЕЖНЫХ ПАЛЯКАЎ

14-га ліпеня ў Варшаве павінен адбыцца зьезд палякаў, што жывуць па-за межамі Польшчы. З прычыны вялікай зацікаўленасьці, якую выклікаў гэты зьезд сярод польскага насельніцтва Савецкага Саюзу, прадстаўнік газэты «Известия» зьвярнуўся да прадстаўніка Усерасійскага грамадзкага камітэту па праведзеньні выбараў дэлегатаў на варшаўскі зьезд палякаў, што пражываюць па-за межамі Польшчы, т. Б. Пшыбышэўскаму, які заявіў наступнае:

У 1927 г. варшаўскі арганізацыйны камітэт зьвярнуўся да рэдакцый польскіх савецкіх газэт з поведамленьнем аб зьезьдзе палякаў, што жывуць па-за межамі Польшчы і аб колькасьці прадастаўляемых мандатаў для прадстаўнікоў польскага насельніцтва савецкіх сацыялістычных рэспублік. Разам з тым варшаўскі камітэт прасіў нашы газэты апавясьціць аб зьезьдзе польскае насельніцтва СССР.

Дзякуючы некаторым акалічнасьцям зьезд тады не адбыўся і быў адкладзен на неакрэсьлены час. Калі стала вядомым, што зьезд адбудзецца ў ліпені 1929 г., нашы польскія газэты, у першую чаргу, кіеўская сялянская газэта «Серп», выступілі з заклікам да польскіх працоўных мас савецкіх рэспублік прыняць удзел у гэтым зьезьдзе.

Заклік нашых газэт знайшоў самы жывы водгук сярод польскіх працоўных мас у СССР. Сходы і выбары адбываюцца амаль **ва ўсіх гарадох і вёсках, дзе толькі пражываюць хоць-бы невялікія групы палякаў.** Наогул, трэба сказаць, што ў ніводнай краіне выбары дэлегатаў на варшаўскі зьезд, як нам вядома, не праводзяцца такім **масавым і дэмакратычным чынам,** як у нашых савецкіх рэспубліках. Аб вялікай зацікаўленасьці працоўных-палякаў, што жывуць у СССР, аб пасылцы сваіх дэлегатаў на [illegible] Польшчу гаворыць хоць-бы той [illegible] вынікі **грашовых збораў** на [illegible]нфэрэнцыі ў СССР і на[illegible] у Варшаву перапілі [illegible]ца на масавых [illegible]аў? Ня гледзячы [illegible]насьць наказаў, [illegible]ое шмат мясцова[illegible]а матар'ялу, можна ўстанавіць рад агульных думак.

Усюды высоўвецца патрабаваньне да дэлегатаў сказаць праўду аб СССР, аб нашым сацыялістычным будаўніцтве, нашых дасягненьнях і цяжкасьцях. У прыватнасьці, — сказаць праўду аб становішчы польскіх працоўных мас СССР, аб іх удзеле ў вялікім будаўніцтве, аб іх вялікіх дасягненьнях і ў галіне гаспадаркі, і ў галіне сацыяльна-культурнага будаўніцтва.

Польскія рабочыя і сяляне выказваюцца ў тым-жа духу, што такі даклад нашай дэлегацыі аб сацыялістычным будаўніцтве і аб дасягненьнях польскіх працоўных мас будзе мець значэньне для абвяржэньня буржуазнага паклёпу аб СССР і для правільнага асьвятленьня тэй ціганцкай практыкі, якая назьбірана польскімі рабочымі і сялянамі разам з працоўнымі іншых нацыянальнасьцяй СССР у справе будаўніцтва сацыялізму.

Ва ўсіх наказах высоўваецца пытаньне аб вайне. Польскія працоўныя масы савецкіх рэспублік патрабуюць, каб іх дэлегаты пратэставалі **супроць ваенных плянаў імпэрыялістых** у адносінах да СССР, расказвалі-б аб тэй няўхільнай **палітыцы міру,** якую савецкая ўлада, абапіраючыся на цьвёрдую волю рабочых і сялян СССР, праводзіць у процілегласьць прыкрытай усякай нацыфіцкай хлусьнёю ліхаманкавай падрыхтоўцы да ваеннага нападу на СССР, што ажыцьцяўляе буржуазная дзяржава.

Нарэшце, пытаньне аб «нацыянальным адзінстве», Польскія рабочыя і сяляне СССР усюды ў сваіх выступленьнях і наказах падкрэсьліваюць, што лёзунг **нацыянальнага адзінства** ня можа стварыць адзінства паміж эксплёататарсмі і эксплёатаемымі, паміж прыгнятальнікамі і прыгнечанымі, што адзіна правільнае і поўнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня, — сапраўднае братэрства і адзінства працоўных усіх нацыянальнасьцяй на падставе будаўніцтва сацыялізму — дасягнута іменна ў Савецкім Саюзе.

Вось асноўныя думкі, якія чырвонай ніткаю праходзяць рашуча праз усе наказы.

Многія дзесяткі тысяч польскіх рабочых і сялян СССР прымаюць актыўны ўдзел у выбарах і абгаварэньні пытаньняў варшаўскага зьезду. Тым ня менш, некаторыя польскія буржуазныя газэты прабуюць паказаць справу ў тым вытнядзе, як быццам выбары праводзяцца нейкімі невядомымі арганізацыямі. Лепшым абвяржэньнем гэтага недарэчнага паклёпу зьяўляецца іменна зацікаўленасьць мас польскага насельніцтва; якія ўскалыхнуліся ва ўсіх частках нашага саюзу. У гэтых-жа польскіх буржуазных газэтах прабуюць адвесьці нашу дэлегацыю спасыльваньнем на тое, што выбарамі ахоплены толькі польскія працоўныя масы ў СССР і што ў выбарах ня ўдзельнічаюць асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў па савецкай канстытуцыі. Каб угадзіць нікчэмнай эксплёататарскай меншасьці польскага насельніцтва СССР, якая налічвае ўсяго два процэнты (10 польскіх буржуазных газэтах хочуць пазбавіць права ўдзелу ў зьезьдзе 98 проц. польскага насельніцтва СССР. І гэта яны называюць дэмакратызмам.

У некаторых польскіх газэтах зьявіліся артыкулы з пагрозамі ў адносінах да дэлегатаў з СССР. Гэтым рабочых і сялян Саюзу ССР не запалохаць. Для таго, каб сказаць праўду аб Саюзе ССР, аб дасягненьнях польскага насельніцтва ў ССР, 14 дэлегатаў польскіх рабочых і сялян ССР, што будуць выбраны на шырокіх масавых сходах, паедуць на зьезд у Варшаву, ня гледзячы ні на якія пагрозы. І мы ўпэўнены, што, хоць ужо цяпер некаторыя польскія буржуазныя газэты патрабуюць ад польскага ўраду, каб ён не дазволіў уезду нашай дэлегацыі, арганізатары зьезду не адважацца пазбавіць магчымасьці ўдзелу на зьезьдзе прадстаўнікоў 800.000 палякаў СССР.

Сьвята левых рабочых фізкультурнікаў ў Бэрліне

вылілася ў магутнае выступленьне рэвалюцыйнага спартыўнага руху

САВЕЦКІМ ФІЗКУЛЬТУРНІКАМ НЯМЕЦКІ ЎРАД АДМОВІЎ У ВІЗЕ

БЭРЛІН, 1. Учора ў Бэрліне адбылося сьвята левых рабочых фізкультурнікаў, якое вылілася ў магутнае выступленьне рэвалюцыйнага спартыйнага руху, якія калі небудзь былі ў Бэрліне. Сьвята мела таксама міжнародны характар, паколькі ў ім удзельнічалі прадстаўнікі адпаведных замежных арганізацый. Члены [illegible] арганізацый камбрыты і камсамолу [illegible] вялікімі чырвонымі сьцягамі і плякатамі, на якіх былі напісаны лёзунгі супроць раскольніцкае палітыкі рэфармістых у спорту і ў абарону СССР. На стадыёне сабралася да 100.000 рабочых. Замежныя дэлегацыі апрача ўласных сьцягаў, несьлі таксама сьцяг СССР з надпісам: «савецкім фізкультурнікам адмоўлена ў дазволе прыехаць на сьвята».

Толькі дзякуючы гэтаму надпісу ўсе ведалі, што нямецкі ўрад адмовіўся даць візу савецкім фізкультурнікам. Чутны былі бурныя выкрыкі абурэньня і пратэсту супроць нямецкае ўрадавае кааліцыі. Перад спартыўнымі спаборніцтвамі тав. Гэкерт сказаў прамову, [illegible] выступаў ад імя кампартыі. Ён заявіў, што вялізная колькасьць рабочых, што сабраліся на сьвята, сьведчыць аб тым, што бэрлінскі пралетарыят стаіць на баку левых фізкультурнікаў, выключаных рэфармістымі з бэрлінскага рабочага спартыўнага аб'яднаньня.

Просьба Францыі аб адтэрмінаваньні плацяжоў Амэрыцы адхілена

ПАРЫЖ, 30. У аб'яднаным пасяджаньні дзьвюх камісій палаты дэпутатаў фінансавай і па замежных справах —Пуанкарэ паведаміў аб адказе ўраду ПАЗШ па крэдзе, ужытым французкім паслом Клодэлем. (Клодэль прасіў аб адтэрмінаваньні да 31-га жніўня плацяжоў у суме 407 мільёнаў долараў у лік доўгу за вайсковыя дастаўкі, якую Францыя павінна была выплаціць 1-га жніўня).

Міністар замежных спраў Стымсон адказаў Клодэлю, што ўрад ПАЗШ, на падставе пастановы кангрэсу можа адтэрмінаваць пляцёж толькі ў тым выпадку, калі да 1-га жніўня Францыя ратыфікуе згоду Мэлён-Бэранжэ, г. зн. згоду аб урэгуляваньні французкага доўгу ПАЗШ.

Паведамленьне аб адказе ўраду ПАЗШ ня выклікала ў пасяджэньні камісіі ніякіх спрэчак. У кулуарных гутарках Поль Банкур, старшыня камісіі па замежных справах, сацыялісты, заявіў, што можна будзе прымірыць прыхільнікаў і праціўнікаў ратыфікацыі шляхам прыняцьця парлямантам рэзалюцыі, якая падкрэсьлівае, што ніякі чарговы плацёж Францыі ПАЗШ ня можа перавышаць па сваіх разьмерах двух апошніх рэпарацыйных плацяжоў, атрыманых Францыяй ад Нямеччыны; у дэкрэце-ж прэзыдэнта рэспублікі аб ратыфікацыі згоды Мэлён-Бэранжэ ня будзе ніякіх агаворак.

Хваляваньні сярод сялян-тубыльцаў у Інда-Кітаі

ПАРЫЖ, 30. Як паведамляе «Юманітэ», у Інда-Кітаі зараз ня спыняюцца хваляваньні сярод сялян-тубыльцаў. Гэтыя хваляваньні выкліканы палітыкай французкай улады, якая гвалтоўна забірае землі тубыльцаў. Траба адзначыць, што **пачатак такой палітыкі ўлады быў пакладзен сацыялістым Варэнам,** калі ён быў генэрал-губэрнатарам Інда-Кітаю.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

ПАЛІЦЫЯ ДАПАМАГАЕ ФАБРЫКАНТАМ

ВАРШАВА, 27. Варшаўская паліцыя актыўна дапамагае фабрыкантам у змаганьні з бастуючымі рабочымі і работніцамі панчошных фабрык. Паліцыя арыштоўвае рабочых, якія зьбіраюцца каля фабрыкі, або толькі праходзяць групамі каля іх і трымае пад арыштам 1-2 дні. («Роб.»).

У ЗАХ. БЕЛАРУСІ

Арышт вучняў беларускае гімназіі

ВІЛЬНЯ, 29. Польская паліцыя ў Вільні арыштавала чатырох вучняў Віленскае беларускае гімназіі: Уладзімера Шчаснога-Пасынка, Уладзімера Кабушка, Яна Кабушка і Яна Байко. Усе арыштаваныя абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да камсамолу Зах. Беларусі, прычым яны нібыта вялі кіраўнічую працу ў камсомольскай арганізацыі Вільні. («К. Віл.»).

Забойства селяніна

ВАРШАВА, 27. У якіх абставінах і якімі спосабамі польская ўлада зьбірае падаткі ў Заходняй Беларусі, паказвае такі выпадак, апісаны ў газэце «Роботніку»:

25 чэрвеня ў в. Гораць Бяроза-Картэзкае гміны, Пружанскага павету зьявіўся вборшчык падаткаў М. Ахацінскі разам з паліцыянтам Пятухом. Прыйшоўшы ў хату селяніна А. Лукаліка, М. Ахацінскі стаў забіраць розныя хатнія рэчы для продажу з ліцытацыі на пакрыцьцё падаткаў. Тым часам каля хаты сабралася шмат суседзяў, якія прасілі адлажыць канфіскацыю маемасьці Лукаліка, але Ахацінскі не паслухаў і гвалтам вырваў у сям'і Лукаліка найпатрэбнейшыя хатнія рэчы. Нарэшце, раззлаваны Ахацінскі выхапіў рэвальвэр і застрэліў Лукаліка. Такое подлае забойства надзвычайна абурыла сялян, і яны хацелі расправіцца з забойцам, але апошні разам з паліцыянтам уцяклі, адстрэльваючыся з рэвальвэраў.

АДСТАЎКА ЯПОНСКАГА УРАДУ

ТОКІЁ, 1. Афіцыйна абвешчана, што рада міністраў пастанавіла падаць у адстаўку. Як паведамляе друк, апазіцыйная партыя Мінсэйта ўжо склала сьпіс будучага габінэту, куды ўваходзяць між іншым, кандыдат у прэм'еры Хамрамгуці, міністра замежных спраў Сідэхара (займаў гэту пасаду ў Кансэйканскім урадзе), вайсковы міністр Уганкі і морскі міністр Таканабэ.

НЯПРЫЕМНЫЯ СЮРПРЫЗЫ „РАБОЧАМУ“ УРАДУ АНГЛІІ

ЛЁНДАН, 25. Перамозе рабочае партыі на выбарах да пэўнай ступені дапамагалі ілюзіі паасобных пластоў пралетарыяту адносна макданальдаўскага габінэту. Аднак, ужо з самага пачатку існаваньня габінэту гэтыя ілюзіі расьсейваюцца. Сярод пралетарыяту нарастае пачуцьцё нездавальненьня «рабочым урадам». Адначасова расчараваныя макданальдаўскім габінэтам рабочыя засыпаюць яго лістамі, у якіх патрабуюць розных рэформ. Гэтыя патрабаваньні рабочых аказаліся вельмі няпрыемным сюрпрызам для Макданальда і К-о. З гэтай прычыны орган рабочае партыі «Дэйлі Гэральд» зьвярнуўся да рабочых з сур'ёзным заклікам «спыніць паток лістоў з патрабаваньнем радыкальных рэформ». Газэта ў перадавіцы зварачаецца у галінах, якія маюць [illegible] працу [illegible] трудасьці [illegible] таксама рашуча і сьмела высоўваюць жанчын на кіраўнічую работу. Недавер'е да жанчыны-работніка павінна быць зьнішчана.

Нам трэба, каб у практычным правядзеньні пяцігадовага пляну, у барацьбе з труднасьцямі сацыялістычнага будаўніцтва прымалі ўдзел найшырэйшыя масы работніц і сялянак.

Гэтыя задачы патрабуюць ад жанадзелаў новых форм і шляхоў работы.

Работа сярод мільённых мас работніц сялянак павінна быць пастаўлена на [illegible] ва ўсю шырыню паставіць [illegible] падрыхтоўцы кадраў жанчыны таксама прымалі ўдзел у самаст[illegible] іх на кіруючую прафсаюзную, [illegible] і партыйную работу».—сказаў [illegible] Каганові, адзін з сакратароў Цэнтральнага Камітэту партыі, у сваёй пра[illegible] на нарадзе загалучкаў аблас[illegible]

Навіны Савецкага Дня

АРГАНІЗАЦЫЯ ЗБОРУ АУТАМАШЫН З ФОРДАЎСКІХ ЧАСТАК

Першая часовая зборка арганізуецца пад Масквою—у Мажэрасе

Калегія галоўмашбуду абгаварвала пытаньне аб месцы і тэрміне арганізацыі першай часовай зборкі аўтамашын з частак, якія будуць атрымлівацца ад Форда.

Разгледжаны былі тры варыянты арганізацыі зборкі: у Мажэрасе (Люблінскія чыгуначныя майстэрні пад Масквою), на заводзе «Гудок Октября» —у Ніжнім Ноўгарадзе і на аўтазаводзе № 2—у Маскве. Калегія прызнала найбольш мэтазгодным арганізаваць часовую зборку ў Мажэрасе, дзе пустыя корпусы чыгуначных майстэрань можна ў самы кароткі тэрмін і з невялікай затратай сродкаў абсталяваць пад зборачны завод. У корпусах гэтых ёсьць таксама магчымасьць лепш расплянаваць працэсы вытворчасьці.

Пастанова калегіі ўжо зацьверджана прэзыдыумам ВСНГ СССР і ўрадам. У сувязі з гэтым Галоўмашбуд даручыў «Металлострою» тэрмінова прадставіць разьлікі аб тэрмінах і кошце пераабсталяваньня люблінскіх майстэрань з тым, каб першая зборка аўтамашын з фордаўскіх частак магла быць пачата не пазьней 1-га сьнежня бягучага году. На працягу першага году павінна быць выпушчана 10-12 тыс. машын у адну зьмену.

Начальніку Аўтабуду тав. Дыбецу, які выехаў у Амэрыку, даручана высьвятліць усе пытаньні, зьвязаныя з арганізацыяй першай часовай зборкі ў Мажэрасе, распрацоўкай праекту арганізацыі зборкі, паступленьнем патрэбнага абсталяваньня для часовага зборачнага заводу і г. д.

Ажыцьцяўленьне дагавору з „Джэнэраль Электрык Кампані“

МАСКВА, 1-га ліпеня пасьля заканчэньня ўсіх фармальнасьцяй набыў моц дагавор аб тэхнічнай дапамозе, заключаны Дзяржаўным электратрэстам («ГЭТ») з буйнейшай амэрыканскай электра - тэхнічнай фірмай «Джэнэраль Электрык Кампані».

ГЭТ, як паведаміў нам намесьнік старшыні праўленьня трэсту тав. Філімонаў, — прыступае да практычнага правядзеньня дагавору ў жыцьцё. У пачатку ліпеня выяжджае ў Амэрыку для практычнае работы на прадпрыемствах «Джэнэраль Электрык Кампані» першая група савецкіх інжынэраў. У першую чаргу камандыруюцца інжынэры, якія будуць заняты на работах па электрыфікацыі Сурамскага перавалу Закаўкаскіх чыгунак. Адначасова выяжджаюць у Амэрыку член праўленьня ГЭТ'у тав. Матлін і старэйшы інжынэр трэсту тав. Тынес, якім даручана арганізаваць у Амэрыцы сталае прадстаўніцтва трэсту для вырашэньня ўсіх пытаньняў, зьвязаных з рэалізацыяй дагавору. ГЭТ ставіць сабе задачаю — шырэй прыцягваць на свае прадпрыемствы замежных высокакваліфікаваных спэцыялістых. У сувязі з гэтым трэст даручае свайму прадстаўніцтву ў Амэрыцы падабраць для работы ў СССР групу амэрыканскіх электрыкаў для кансультацыі пастаноўкі на нашых заводах новых вытворчасьцяй. У бліжэйшы час прыяжджае ў СССР першая група спэцыялістых. «Джэнэраль Электрык» для кансультацыйных работ, зьвязаных з рэалізацыяй дагавору.

Збор ураджаю

СТАЎРОПАЛЬ, 20. У Мядзьвежынскім і Маскоўскім раёнах прыступлена да збору ўраджаю. У сярэднім азімыя даюць 14 цэнтнэраў, ячмень—25 цэнтнэраў з гектару.

ПРАПАНОВА ПРАФ. ПРЭАБРАЖЭНСКАГА

МАСКВА, 1. На нарадзе пры ўрадавым камітэце па хэмізацыі абгаварвалася прапанова прафэсара Прэабражэнскага аб пастаноўцы практыкі здабычы калійных соляй на Урале мэтадам вышчалачваньня іх праз буравыя шчыліны гарачай вадою. Нарада прызнала, што запрапанаваны праф. Прэабражэнскім новы спосаб здабычы калійных соляй мае надзвычайна важнае значэньне, асабліва ва ўмовах Салікамскага месцанараджэньня. Пастаноўлена шырока разьвіць практыку вышчалачваньня яшчэ ў 1929-30 г. г., як у лябараторыі, так і ў палавым маштабе. Для правядзеньня гэтае практыкі павінны быць прадугледжаны ў бюджэце будучага году асыгнаваньні ў разьмеры ня менш 300 тысяч рублёў. Усе работы павінны весьціся пад наглядам прафэсара Прэабражэнскага.

Першы тыраж пазыкі 1929 году

МАСКВА. У нядзелю ў Маскве адбыўся тыраж выйгрышнае пазыкі 1929 году. Разыграна 4.531 выйгрыш па 100 руб., 1.000 па 250 руб., 50 па 1.000 рублёў, 10 па 5.000, 5 па 10.000 руб., 2—па 25.000 руб., 1— 50.000 руб. і 1 выйгрыш у 100.000 руб. Усяго—5.600 выйгрышаў на агульную суму 1.053.100 руб.

Буйныя выйгрышы прыпалі на наступныя нумары сэрый і аблігацый: сэрыя 821 аблігацыя 10—выйгрыш 5.000 руб. Сэрыя 1.682, аблігацыя 16—выйгрыш 10 тысяч руб. Сэрыя 1.942, аблігацыя 29—выйгрыш 5.000, Сэрыя 3.277, аблігацыя 40—выйгрыш 10.000 руб. Сэрыя 3.470, аблігацыя 13—выйгрыш 10.000 руб. Сэрыя 3.621, аблігацыя 4—выйгрыш 5.000 руб. Сэрыя 4.058, аблігацыя 46—выйгрыш 5.000 руб. Сэрыя 4.583, аблігацыя 32—выйгрыш 10.000 руб. Сэрыя 5.246, аблігацыя 1—выйгрыш 10.000 руб. Сэрыя 5.578, аблігацыя 24—выйгрыш 5.000 руб. Сэрыя 6.319, аблігацыя 5—выйгрыш 25.000 руб. Сэрыя 6.376, аблігацыя 10—выйгрыш 25.000 руб. Сэрыя 7.234, аблігацыя 28—выйгрыш 5.000 руб. Сэрыя 7.457, аблігацыя 44—выйгрыш 50.000 руб. Сэрыя 8.432, аблігацыя 21—выйгрыш 5.000 руб. Сэрыя 8.856, аблігацыя 45—выйгрыш 100.000 руб. Сэрыя 8.908, аблігацыя 18—5.000 рублёў. Сэрыя 9.358, аблігацыя 39—выйгрыш 5.000 руб. Сэрыя 9.551, аблігацыя 39—выйгрыш 5.000 руб.

Прыгавор над удзельнікамі самасуду

ПАДОЛЬСК, 29. Позна ўначы, у прысутнасьці 3.000 падольскіх рабочых вынесен прысуд над удзельнікамі самасуду. **Камароў і Цюрын Янка** прысуджаны да пазбаўленьня волі на 7 год з суровым адмежаваньнем. **Клімкін**—да пазбаўленьня волі на 5 год з суровым адмежаваньнем. **Сэйфулін** — на 4 гады з суровым адмежаваньнем, **Цюрын Мікола** —на 3 з палов. г. з суровым адмежаваньнем, **Хромаў Канстантын** на 2 з паловай гады бяз суровага адмежаваньня, **Шынкароў** на 2 гады бяз суровага адмежаваньня. Усе без канфіскацыі маемасьці і без паражэньня ў правох.

Суд пастанавіў апрача таго, прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці **Цёміна, Семенічыкава, Трунова, Апанасьева і Ласкутова,** бо ўстаноўлена, [illegible] і больш рашучага вы[illegible]

Начальнік заводзкае варты [illegible] і начальнік міліцыі Дабр[illegible] воласьці Мацьвееў судом [illegible]

Да дзесяцігодзьдзя Вэрсальскага дагавору

Дзень нацыянальнае жалобы ў Данцыгу

ВАРШАВА, 29. У Данцыгу дзень гадавіны Вэрсальскага дагавору, паводле якога Данцыг быў адлучан ад Нямеччыны, абвешчан днём нацыянальнае жалобы. У горадзе адбыліся дэманстрацыі супроць Вэрсальскага дагавору. Польскі прадстаўнік у Данцыгу Страсбургер зрабіў з гэтага поваду прадстаўленьне данцыгскаму ўраду, зазначыўшы, што Данцыг абавязан выконваць пастанову Вэрсальскага дагавору.

Скліканьне англа-амэрыканскай канфэрэнцыі па разбраеньні

ЛЁНДАН, 29. «Дэйлі Тэлеграф» паведамляе, што амэрыканскі ўрад згадзіўся на скліканьне палярэдняе «канфэрэнцыі дзьвюх дзяржаў» пам орскім разбраеньні ў Лёндане. (У канфэрэнцыі будуць удзельнічаць толькі Англія і ПАЗШ). Дыплёматычны агляддальнік газэты заяўляе, што паведамленьне аб згодзе амэрыканскага ўраду на скліканьне гэтай канфэрэнцыі ангельскія палітычныя колы сустрэлі з вялікім здавальненьнем. Агляддальнік заяўляе, што згода амэрыканскага ўраду па скліканьне папярэдняе канфэрэнцыі па морскім разбраеньні зьяўляецца выразам прыяцельскіх адносін ПАЗШ да Англіі. Па думцы агляддальніка, Макданальд хутка абвесьціць тэрмін скліканьня канфэрэнцыі.

ПАЗШ правакуюць вайну паміж Гватэмалай і Гандурасам

НЬЮ-ЁРК, 29. Як паведамляюць з Мэксыко, правадыр Нікарагуанскіх паўстанцаў Сандзіно прыбыў у Вэра-Круц (Мэксыка). Сандзіно заявіў, што ПАЗШ правакуюць вайну паміж Гватэмалай і Гандурасам для таго, каб мець повад умяшацца ва ўзброены канфлікт. Пад прыкрыцьцем інтэрвэнцыі ПАЗШ створаць морскую базу на пагранічнай мяжы Гватэмалы і Гандураса.

Увага: Урад Гандураса ў сакавіку

ЗА ВЫРАЗНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАЧ ПАРТЫІ ПА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАБУДОВЕ ВЁСКІ

З дакладу тав. МІЦЬКОВА на нарадзе загадчыкаў аддзелаў акружкомаў па рабоце ў вёсцы

Задачы аддзелаў АК КП(б)Б па рабоце ў вёсцы выцякаюць з агульных задач партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, узмацненьні тэмпу калгаснага і саўгаснага будаўніцтва і шырокага разгортвання вытворчага каапэраваньня.

Выкарчоўваньне карэньняў капіталізму ў вёсцы, далейшае наступленьне на капіталістычныя элементы, перабудаваньне сельскае гаспадаркі на новай больш высокай тэхнічнай базе, правядзеньне ў жыцьцё новых форм змычкі рабочае клясы з асноўнымі масамі вёскі, поўнае забесьпячэньне ва ўсёй рабоце клясавай лініі—усё гэта патрабуе ўзмацненьня і паляпшэньня работы на вёсцы і работы саміх аддзелаў. Вынікі гадавое работы аддзелаў сьведчаць, што аддзелы па рабоце ў вёсцы зьяўляюцца неабходным падвазьнікам партыі на ўсіх вучастках работы ў вёсцы.

Трэба адзначыць, што ў рабоце аддзелаў ёсьць рад недахопаў, якія тлумачацца тым, што аддзелы яшчэ ня маюць паўнага вопыту ў рабоце, яны не афармілася яшчэ як аддзелы камітэтаў, не ўкамплектаваны інструктажам і г. д.

Недастатковая сувязь з месцамі, недастатковая дапамога вясковым партыйным арганізацыям зьяўляецца адным з галоўных недахопаў аддзелаў па рабоце ў вёсцы.

Пераходжу да асобных пытаньняў работы і чарговых задач аддзелаў.

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ

Калгаснае будаўніцтва ва ўмовах БССР мае вялікае палітычна-практычнае значэньне. Надзвычайная раздробленасьць сельскае гаспадаркі перашкаджае эканамічнаму разьвіцьцю краіны. Перамагчы гэту перашкоду, пасьпяхова вырашыць праблему аграрнага пераназяленьня, перабудаваць вёску на новы сацыялістычны лад мы зможам толькі шляхам калектывізацыі і вытворчага каапэраваньня, шляхам аб'яднаньня бядняцка-серадняцкіх мас сялянства ў буйныя калектывы.

Вось чаму пытаньні калектывізацыі зьяўляюцца асноўнай задачай аддзелаў АК КП(б)Б па рабоце ў вёсцы.

Зараз мы канстатуем пэўныя посьпехі на фронце калектывізацыі. Плянавыя заданьні выкананы поўнасьцю. Мы павінны былі правесьці калектывізацыю на плошчы ў 59 тысяч гэктараў. Гэта заданьне выканана з перавышэньнем на 6 тыс. гэкт. Колькасны рост калгасаў ідзе адначасова з іх узбуйненьнем. Праўда, тэмп узбуйненьня павольны, але і на гэтым вучастку мы маем дасягненьні. У мінулым годзе **на адзін калгас** у сярэднім **прыходзілася 66 гэктараў зямлі, а зараз—каля 130.** У асобных округах ёсьць факты, калі сотні бядняцка-серадняцкіх двароў аб'ядналіся ў калектывы.

Побач з колькаснымі дасягненьнямі ў калгасным будаўніцтве ёсьць і якасныя недахопы. Калгасы ня маюць арганізацыйна вытворчых плянаў. Гэта адбіваецца на пляцяваньні ў гаспадарчай рабоце калектываў, крэдытаваньні і г. д. Пры арганізацыі новых калгасаў у асобных выпадках былі дапушчаны скрыўленьні партыйнай лініі. **У Полачыне і Бабруйшчыне** кулацтва арганізоўвала свае ўласныя калгасы. **У Лепельскім** раёне прышлося ліквідаваць некалькі **яўна-кулацкіх ілжэ-калгасаў.** Мэтай-жа Полачыне былі выпадкі, калі беднату і сераднятва ў прымусовым парадку запісвалі ў калектывы. Гэтыя факты гавораць за тое, што некаторыя вясковыя партарганізацыі невыстарчальна кіравалі калгасным будаўніцтвам і ня поўнасьцю ўсьвядомілі прынцыпы калектывізацыі. Часта віны **ляжыць на аддзелах АК КП(б)Б па рабоце ў вёсцы.** Аддзелы **не аказалі** гэтым арганізацыям практычнай дапамогі, не рэагавалі своечасова на памылкі і скажэньні правільнай лініі пры арганізацыі новых калектываў. **Рашучае ўзмацненьне тэмпу калгаснага будаўніцтва зьяўляецца першачарговай, галоўнай задачай у далейшай рабоце аддзелаў.**

Аддзелы АК па рабоце ў вёсцы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на паішырэньне і ўзбуйненьне існуючых калгасаў, на павялічэньне абагуленасьці сродкаў вытворчасьці. Аддзелы павінны зрабіць усе захады да шырокага разгортваньня культурна-масавай, палітычна-выхаваўчай работы ў калгасах.

ЗМАГАЦЦА З КАНКРЭТНЫМІ ПРАЯВАМІ ПРАВАГА ЎХІЛУ І ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ВЫРАЗНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ КЛЯСАВАЙ ЛІНІІ

Выканьне грандыёзных задач па сацыялістычным перабудаваньні вёскі павінна праходзіць пад знакам разгорнутага наступленьня на капіталістычныя элементы, пад знакам барацьбы з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі.

Аддзелы АК па рабоце ў вёсцы павінны мабілізаваць вясковыя партарганізацыі на яшчэ больш глыбокую і шырокую барацьбу з канкрэтнымі праяўленьнямі правага ўхілу і прымірэнцтва, з апартуністымі і панкёрамі з правага лягеру, з скажэньнем клясавай лініі ў практычнай рабоце.

Аддзелы павінны змагацца з недаацэнкай значэньня груп беднаты і работы з беднатой, бо па сутнасьці такая недаацэнка зьяўляецца яскравым праяўленьнем правага ўхілу. Трэба наладзіць сталую сыстэматычную дапамогу вясковым партыйным арганізацыям у іх барацьбе з правымі элемэнтамі, з скажэньнямі клясавай лініі партыі. Факты з месц сыгналізуюць аб тым, што правыя элемэнты ў радох некаторых партарганізацый пачынаюць разгортваць актыўную дзейнасьць і адкрыта выступаць супроць лініі партыі.

У м. **Бабры (Аршаншчына)** пад старшынствам аднаго з мясцовых камуністых адбыўся сход заможнікаў, на якім гэты «партыец» праваліў пытаньне аб арганізацыі калгасу. Тут перад намі факт адкрытага арастаньня з кулацтвам і выступленьня супроць лініі партыі.

Асобныя парт'ячэйкі і нават некаторыя райкомы партыі несвая́часова рэагуюць на правы апартунізму ў практычнай рабоце, прымірэнча адносяцца да выступленьняў клясавага ворага, несвая́часова рэагуюць на факты скрыўленьня клясавай лініі.

Расьнянскі РК КП(б)Б (Аршанская акруга), падводзячы вынікі перавыбараў канпэрацыі, прыняў наступную пастанову: **«У часе перавыбараў клясавае барацьбы ня было».** А на справе кулацтва адзіным фронтам выступіла супроць ячэек, агітавала супроць дыфэрэнцыраванага паю. Паданыя факты поўнасьцю абвяргаюць разважаньні аб тым, што в правым ухілам ужо пакончана. Аддзелы АК па рабоце ў вёсцы павінны дапамагчы партыйным органам узмацніць рашучую барацьбу супроць правых і прымірэнцаў, супроць капітулянтаў перад кулаком, супроць тых, якія перашкаджаюць пасьпяховаму правядзеньню ў жыцьцё генэральнай лініі ў адносінах вёскі.

РАБОТА СЯРОД БЕДНАТЫ

У правядзеньні работы сярод батрацтва і беднаты мы дабіліся некаторага пералому.

Выраслі палітычная сьвядомасьць батрацка-бядняцкіх мас вёскі, павялічылася актыўнасьць. Узмацніўся ўплыў беднаты ў [illegible]ветах, каапэрацыі і г. д. Усё-ж гаспадарча-палітычная арганізацыя батракоў і беднаты зьяўляецца найбольш слабым месцам у партыйнай рабоце на вёсцы. Аддзелы па рабоце ў вёсцы не праявілі ў гэтым напрамку выстарчальнай ініцыятывы і энэргіі. У выніку работа груп беднаты нярэдка разьвіваецца з задачамі забесьпячэньня клясавай лініі і ўзмацненьня бядняцка-сераднякага блёку. Мы мелі рад выпадкаў, калі склікаліся закрытыя сходы беднаты і груп беднаты. На гэтыя сходы сераднякі не дапускаліся. Такія факты заўважваліся **ў Глускім** раёне, **Мазыршчыне** і г. д. Аддзелы па рабоце ў вёсцы павінны выправіць гэтыя памылкі і ў штодзённай практычнай рабоце з беднатой усямерна **ўзмацніць бядняцка-сераднякі блёк,** прыцягваць сераднякі актыву да ўдзелу ў рабоце груп беднаты, выхоўваць і ўцягваць у практычную работу бядняцка-сераднякі актыў. Аддзелы павінны рэагаваць на ўсялякія выпадкі ігнараваньня інтарэсаў сераднятва ў пастановах груп беднаты, своечасова выпраўляць гэтыя недахопы.

Колькасьць груп беднаты яшчэ зусім невыстрачальная. Сталага партыйнага кіраўніцтва работай груп няма. Некаторыя АК і раённыя камітэты нават зусім ня ведаюць аб колькасьці груп беднаты ў акрузе і раёне.

Паляпшэньне работы сярод батрацтва і беднаты павінна стаць **баявым лёзунгам** у практычнай рабоце аддзелаў і ўсіх вясковых партарганізацый.

Правядзеньне ў жыцьцё задач сацыялістычнай рэканструкцыі, наступленьня на кулацкія элемэнты і далейшага ўзмацненьня бядняцка-сераднякага блёку магчыма толькі тады, калі мы пасапраўднаму наладзім работу сярод батрацтва і беднаты, мабілізуем батрака і бедняка на выкананьне гэтых задач, на барацьбу з кулаком.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

Сацыялістычнае спаборніцтва на вёсцы зьяўляецца магутным сродкам для прыцягненьня батрацтва, беднаты і сераднятва да актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве сацыялізму.

Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва паміж саўгасамі, калгасамі і вёскамі, мабілізуючы ўвагу мас паўкола гэтага пытаньня, мы вырашым задачы па калектывізацыі і вытворчым каапэраваньні, па рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Асноўны недахоп на гэтым фронце: саўгасы і калгасы позна ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва. Спаборніцтва на вёсцы пачынае разгортвацца толькі зараз.

Параднасьць, павярхоўны падыход, супроць якіх рашуча выступіла рабочая грамадзкасьць, маюць месца і на вёсцы. Саўгасы, калгасы і вёскі нярэдка ўступаюць у спаборніцтва бяз пэўнай падрыхтоўкі. Ёсьць факты, калі гаспадарча-палітычныя дагавары, заключаныя паміж асобнымі раёнамі, не адпавядаюць задачам павялічэньня ўраджайнасьці і пашырэньня пасеўнай плошчы. Яскравы прыклад: дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве, заключаны паміж **Парыцкім і Глускім** раёнамі **(Бабруйская округа).**

Заключаючы гэты дагавор, раёны абавязаліся: **«Павялічыць ураджайнасьць да 1930 году на 10 процантаў».** Гэтая лічба **зусім не адпавядае нашым плянавым заданьням.** Нават аграмінімум для гэтых раёнаў патрабуе больш шпаркага росту ўраджайнасьці.

Аддзелы па рабоце ў вёсцы павінны цьвёрда ў баку ад сацыялістычнага спаборніцтва, своечасова зьвяртулі ўвагу на гэты адказны вучастак работы.

Далейшая задача аддзелаў заключаецца ў тым, каб усямерна садзейнічаць разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы і забясьпечыць сталае партакіраўніцтва ў практычным ажыцьцяўленьні гэтае задачы. Сацыялістычнае спаборніцтва павінна стаць пастаянным мэтадам работы.

ПЫТАНЬНІ ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЯ

Пытаньні зямляўпарадкаваньня павінны заняць асабліваё месца ў рабоце аддзелаў.

Практычнае правядзеньне зямляўпарадкаваньня не заўсёды адпавядала клясавым задачам партыі. На гэтым вучастку работы мы мелі чмадз[illegible] скажэньня лініі партыі. У выніку, зямляўпарадкаваньне не заўсёды зьяўлялася спымулам да разьвіцьця калектывізацыі, да шырокага пераходу на калектыўныя спосабы апрацоўкі зямлі. Каля 20 процантаў зямляўпарадкаванай плошчы ў мінулым годзе было парэзана на хутары.

Аддзелы па рабоце ў вёсцы павінны стала і пільна сачыць за поўным правядзеньнем дырэктыў партыі ў адносінах зямляўпарадкаваньня.

Зямляўпарадкаваньне павінна поўнасьцю адпавядаць лініі партыі на калектывізацыю сельскае гаспадаркі і рашучае абмежаваньне магчымасьцяй далейшага росту кулацкіх гаспадарак.

Практыка арганізацыі хутароў, адрубаў і дробных пасёлкаў павінна быць канчаткова спынена.

Дырэктывы партыі аб неабходнасьці рашуча змагацца з парушэньнямі асноўнай нацыянальнай зямлі і з выпадкамі незаконнай арэнды яшчэ невыстрачальна праводзяцца ў жыцьцё. У радзе раёнаў ёсьць факты продажу зямлі, поўнага скажэньня правільнай лініі ў арэндным пытаньні. **У Полачыне** ў адным з сельсаветаў было 20 выпадкаў адкрытага продажу зямлі. **Крупскі** райвыканком **(Аршанская округа)** зусім не вьвяртае ўвагі на тое, як праходзіць здача зямлі ў арэнду. Па вестках выканкому выходзіць, што са здачай зямлі ў арэнду справа абстаіць добра, а ў рэчаіснасьці гэта зусім ня так. У раёне ёсьць цэлы ад фактаў яўнага скажэньня клясавай лініі і зямельнага кодэксу. Пад шыльдай арэнды зямля незаконна прадавалася. Аддзелы павінны своечасова рэагаваць на такія зьявішчы

Генэральная праверка і чыстка партыйных радоў

АКРУГОВЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПРЫСТУПАЮЦЬ ДА МАСАВАЙ ПРАВЕРКІ ПАРТ'ЯЧЭЕК ВАЙСКОВЫХ І ВЯСКОВЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

Кожная парт'ячэйка павінна мабілізаваць рабочыя, батрацкія масы і сялянскую беднату для удзелу ў чыстцы партыі

ЯК ПРАЙШЛА ПРАВЕРКА КІРУЮЧЫХ КАДРАЎ

Полацкая акруговая партарганізацыя

Старшыня камісіі ЦКК УсеКП(б), якая праводзіла праверку кіруючых кадраў Полацкай акрпартарганізацыі, тав. Рыскін у гутарцы з нашым акруговым карэспандэнтам сказаў:

— Камісія правяла 20 кіруючых партыйных працаўнікоў—членаў і кандыдатаў ЦК, членаў ЦКК, членаў і кандыдатаў бюро АК і прэзыдыуму АКК КП(б)Б. Сходы парт'ячэек, на якіх праваряліся гэтыя таварышы, былі вельмі шматлюднымі. На асобных куставых сходах памяшканьні нават не маглі зьмясьціць усіх прышоўшых на сход. Агульная лічба прысутных даходзіць да 2.000, з якіх каля 600 чалавек камуністых. Гэта гаворыць за тое, што ўвага як партыйнай, так і беспартыйнай масы да праверкі была вельмі вялікая.

Партыйныя ячэйкі гораду досыць добра падрыхтаваліся да праверкі. Аднак, у часе праверкі мелі месца і спроба з боку асобных таварышоў зводзіць асабістыя рахункі з таварышамі, што праваряліся, капаньне ў дробязях. Гэта паказвае, што задачы чысткі яшчэ ня ўсе члены партыі і беспартыйныя добра зразумелі. Усё-ж трэба сказаць, што праведзеная праверка паказала, наколькі высунутыя ўсёй партыяй мерапрыемствы па ачышчэньні сваіх радоў ад чужых і шкодных элемэнтаў зьяўляецца справай вялікай важнасьці, што гэтыя мерапрыемствы высока ацэньваюцца ўсёй партыйнай і беспартыйнай масай.

Камісія на сходах атрымала ўсё тое, што магло даць ёй шырокія магчымасьці правільна арыентавацца ў падыходзе да ацэнкі кожнага таварыша.

Пры праверцы сход накіраваў сваю ўвагу ня толькі на выяўленьне якасьці праверанага, як камуністага, але і высьвятленьне яго работы, правядзеньня клясавай лініі партыі, годнасьці яго, як працаўніка на вытворчасьці, установе і г. д. Праўда, больш за ўсё партарганізацыі цікавіліся мінулым сваіх кіраўнікоў. І гэта, зразумела, большая частка іх не зьяўляецца карэннымі працаўнікамі акругі. Ведаючы аб працы кожнага—дзе арганізацыя не асабліва вялікая, зацікаўленасьць да высьвятленьня рэпалюцыйнага мінулага сваіх кіраўнікоў зьяўлялася часта цэнтрам увагі і ў часе праверкі.

Праверка кіруючых кадраў як у ваеннай партарганізацыі, так і на гарадзкіх сходах паказала, што вайсковыя таварышы, трэба аддаць справядлівасьць, былі больш актыўнымі. **З ліку праверных выключаных з партыі няма.** Але камісіяй раду таварышоў зроблены заўвагі адносна іх работы і кіраўніцтва.

Праверка паказала, **што кіруючы склад Полацкай партарганізацыі—здаровы і здольны ажыцьцяўляць, пры актыўным удзеле партыйнай масы, важнейшыя дырэктывы партыі.**

Камісія ўпэўнілася, што кіруючыя кадры арганізацыі зьяўляюцца ідэалёгічна вытрыманымі і здольны забясьпечыць правільнае практычнае ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў партыі.

Кіруючы склад арганізацыі зьяўляецца згуртаваным ядром, якое карыстаецца аўтарытэтам у масах партыйцаў і беспартыйных рабочых і сялян. Кіруючыя кадры здолеюць весьці за сабою праз труднасьці ўсю партарганізацыю, да ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі па сацыялістычным будаўніцтве.

Камісія сваю работу скончыла, правёўшы няць сходаў і пабываўшы, акрамя Полацку, на гуце «Праца» і ў Лепелі.

Зараз камісія выехала ў Воршу.

Л. Б.

10 дзён праверкі

(Партарганізацыя N'-га артпалка)

Прайшлі 10 дзён праверкі і чысткі партыйнай арганізацыі №-га артпалка. Праверана каля 45 таварышоў. Чыстка нашай партыйнай арганізацыі абярнулася ў праверку ўсяе работы партыйнае арганізацыі.

Вяз сьпешкі, спакойна, з усёй партыйнай адказнасьцю працуе камісія і партарганізацыя. Праверачныя сходы праходзяць пры вялікай актыўнасьці як партарганізацыі, так і беспартыйных чырвонаармейцаў.

Пры праверцы некаторых таварышоў выступаюць па 14-17 чалавек. Зьмест выступленьняў сьведчыць аб тым, што задачы чысткі ў асноўным партарганізацыя і беспартыйныя масы зразумелі добра. За тэрмін 10 дзён мы ня мелі выпадкаў зьвядзеньня асабістых рахункаў. Сходы праходзяць пад знакам шырока разгорнутай самакрытыкі.

Апіраючыся на актыўную дапамогу беспартыйных, камісія выявіла адну клясава-чужую асобу, якая ашуканствам, утаіўшы сваё калацкае паходжэньне пралезла ў рады партыі.

Камісія выключыла яго з партыі. Таксама выключаны з кандыдатаў партыі Парфімовіч, які ўтаіў ад партыі сваё дваранскае паходжэньне.

Вакол першых вынікаў чысткі зараз шырока разгортваецца адпаведная выхаваўчая работа сярод беспартыйных.

Партарганізацыя паставіла сваёй мэтай зараз максымальна скарыстоўваць выхаваўчае значэньне чысткі—для ўзмацненьня росту, вярбоўкі ў рады партыі рабочых, батракоў і сялян-беднякоў.

Чыстка ўзмоцніць баяздольнасьць партыйнага калектыву палка і гатоўнасьць нашае часьці.

ЗЛАТКІН.

Пры шырокім удзеле мас

(МАЗЫР)

Скончылася праверка кіруючых кадраў па Мазырскай партарганізацыі. Перад камісіяй па праверцы кіруючых кадраў і шматлюднымі сходамі партыйцаў і беспартыйных рабочых праходзілі члены ЦК, ЦКК, бюро АК і прэзыдыуму АКК.

Камісія, партыйная і беспартыйная маса рабочых уважліва, дзелавіта і сур'ёзна падыходзілі да кажнага праверанага. Ад сваіх кіраўнікоў партыйная і рабочая маса патрабавала большай сувязі з масамі. Ад сваіх рабочых выдвіжэнцаў масы патрабавалі, каб яны на вытворчасьці больш выяўлялі свой партыйны твар, каб яны паказалі сябе сапраўднымі кіраўнікамі і ініцыятарамі ў правядзеньні мерапрыемстваў партыі па ўзьнаўленьні вытворчасьці, каб яны практычным сваім прыкладам уцягвалі рабочыя масы ў сацыялістычнае спаборніцтва, у работу вытворчых нарад, у правядзеньне мерапрыемстваў па рацыяналізацыі вытворчасьці.

На жаль, камісіі прышлося канстатаваць (аб гэтым красамоўна гаварылі выступленьні рабочых), што некаторыя рабочыя вылучэнцы сябе не апраўдалі. Асобныя члены кіруючых парторганаў, працуючы каля варштату, сябе не паказалі ініцыятарамі ў практычным правядзеньні важнейшых дырэктыў. Такім аказаўся член ЦКК КП(б)В і член прэзыдыуму Мазырскай АКК тав. **Гнусевіч, якому праверачная камісія абвешчана вымова.**

Пры праверцы выявіўся і факт утойваньня ў партдакумантах кандыдатам у члены бюро АК тав. **Віршыцам** неэтычнага праступку, які выявіўся ў арэндзе млыну ў 1921 годзе (некалькі месяцаў). Камісія, маючы на ўвазе яго адданасьць партыі, яго актыўную работу, на якой ён сябе апраўдаў, **абвясьціла Віршыцу вымову.**

Праведзеныя сходы па чыстцы кіруючага складу партарганізацыі паказалі, што партыйныя і рабочыя масы правільна зразумелі задачу партыі па чыстцы сваіх радоў. За выключэньнем 2-3 усе выступленьні былі здаровыя, ня было дробных капаньняў у асабістым жыцьці, ня было выпадкаў зьвядзеньня асабістых рахункаў. Гэта дазваляе спадзявацца, што чыстка радоў арганізацыі пройдзе так, як вымагаюць задачы партыі.

Б. Ш.

Не прыніжаць палітычных задач чысткі

Як паведамляе акруговая гомельская газэта «Полесская Правда»:

— 25 чэрвеня чыстку і праверку праходзілі кіруючыя таварышы, што працуюць і прымацаваныя да залінейнай арганізацыі, у ліку 12 чалавек: Аніськовіч, Вэндэ, Зубрыцкі, Іваноў А., Кофман, Купіца, Пятрыкевіч, Празьнікаў, Рак, Філіповіч, Чацьвяргоў і Горачаў.

Праверка праходзіць пры актыўнейшым удзеле партыйных і беспартыйных рабочых-чыгуначнікаў.

Перад сходам праходзілі старыя, кваліфікаваныя рабочыя, высунутыя партыяй на адказныя работы.

На гэтым сходзе, у ліку іншых, праверку праходзілі тав. Куніца—заг. АППА акругкому, тав. Кофман—былы старшыня акрпрафбюро, цяпер заг. Белпапертрэсту і тав. Вэндэ—заг. арганізаддзелам акругкому.

Рабочыя-чыгуначнікі далі аб гэтых таварышах [illegible]

Не абышлося, зразумела, без некаторых момантаў асабістага выпаду супроць пазасобных таварышоў. Напрыклад, тав. Пятрыкевіч—член партыі з 1919 году—быў ахарактарызаваны адным з прысутных, як нячулы да рабочых (Пятрыкевіч—вагонны майстар). А гэтая «нячуласьць» выявілася ў тым, што ён Пятрыкевіч, нібы не захацеў выдаваць яму, рабочаму, рукавіцы... Або тав. Рак—сакратар залінейнага райкому—быў адным таварышом-партыйцам абвінавачаны ў няўважлівых да яго адносінах, якія выявіліся ў тым, што тав. Рак, як сакратар райкому, не дапамагаў яму ў прадастаўленьні кватэры.

Была таксама спроба з боку адназ гаспадыні-дамаўласьніцы врабіць паклёп на аднаго таварыша і тым самым пазбавіцца ад яго, няўгоднага ёй кватаранта.

Аднак, сход даў ёй належны адпор. Яна была выкрыта.

Здаровым пралетарскім пачуцьцём чыгуначнікі ацанілі кожнага таварыша па вартасьці.

Тав. Чацьвяргоў, які праходзіў тамжа праверку, быў цэлым радам таварышоў ахарактарызаваны з адмоўнага боку, галоўным чынам, што ён ня зьвязаны з шырокімі рабочымі масамі.

Многія абвінавачаньні супроць тав. Чацьвяргова былі тут-жа абвергнуты.

Дэтальна гэтым пытаньнем займецца камісія ЦКК УсеКП(б), якая дасьць сваё заключэньне.

Правяраем падрыхтоўку

(ПУХАВІЦКАЯ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ, МЕНСК. АКР.)

Адразу-ж пасьля XII зьезду КП(б)Б райком партыі распачаў работу па падрыхтоўцы арганізацыі да чысткі партыйных радоў. Аднак, ня гледзячы на дырэктывы райкому і вышэйшых парторганаў, ячэйкі да чысткі правялі падрыхтоўку слаба.

Зараз, калі прыбыла камісія на чыстцы і праверцы нашай райпартарганізацыі, праводзіцца праверка як ячэйкі, так і партарганізацыя ў цэлым падрыхтаваліся да чысткі. Так, 27 чэрвеня быў скліканы пашыраны пленум райкому партыі, на якім прысутнічалі ўсе сакратары парт'ячэек і раённы партактыў.

На пленуме тав. Вэйлін зрабіў даклад аб задачах чысткі і праверкі партыі, а потым тав. Казачонак зрабіў інфармацыю аб стане падрыхтоўчай работы ў партарганізацыі. На пленуме адзначана, што Блуская ячэйка правяла падрыхтоўку слаба: інструкцыя ЦКК не распрацавана, сярод батракоў і беднаты задачы і значэньне чысткі партыі не растлумачаны. Ня важна з падрыхтоўкай стаіць справа і ў Кнорынскай ячэйцы КП(б)Б.

Недапушчальны факт, які гаворыць аб тым, што некаторыя партыйцы абсалютна не зразумелі палітычных задач і значэньня чысткі, ня маюць прадстаўленьня аб парадку яе правядзеньня, выяўлены ў **Вяленскай ячэйцы.** У гэтай ячэйцы на агульным партсходзе паставілі пытаньне аб чыстцы і па альфабэце пачалі «правяраць» усіх членаў партыі. А калі прагледзелі так усіх вынесьлі агульным сходам пастанову: «лічыць праверанымі». Райком партыі на гэты недапушчальны момант своечасова рэагаваў і выправіў памылкі ячэйкі ў падрыхтоўчай яе рабоце.

Пленум райкому ў тыя ячэйкі, дзе слаба падрыхтаваліся да чысткі, накіраваў таварышоў з раённага партактыву для практычнай работы і дапамогі ячэйкам. Побач з гэтым пленум даў дырэктыву ячэйкам, каб яны выкарысталі той час, які застаўся да чысткі, для максымальнай падрыхтоўкі, для забесьпячэньня ў чыстцы актыўнага ўдзелу беспартыйных працоўных мас.

А. КАСТРЫЦКІ.

Сацыяльны склад камуністых-сялян БССР

Ленін ня раз адзначаў, што а дробнае таварнае вытворчасьці вырастае капіталізм. Дробная вытворчасьць параджае капіталізм і буржуазію пастаянна, штодня, кожную гадзіну, стыхійна і ў масавым маштабе,—пісаў ён.

Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) 1928 году, характарызуючы бягучы пэрыяд, адзначаў, што: «Рабочая кляса ў моцным саюзе з сялянскімі масамі, прыступае пасусім фронце, уключаючы адстаўцу вёскі, да выкарчоўваньня карэньняў капіталізму, які харчуецца глебаю дробнае таварнае гаспадаркі».

З сказанага зусім пэўна вынікае, якую ўвагу ў пэрыяд узмоцненага «выкарчоўваньня карэньняў капіталізму» партыя павінна зварачаць на склад сваіх арганізацый на вёсцы.

Камуністы-сяляне ня толькі пастаянна знаходзяцца ў дробна-буржуазным акружэньні, але і самі зьяўляюцца дробнымі таваравытворцамі. Дзейнічаючы базе дробнае таварнае вытворчасьці, самі выяўляюць усе адносіны, [illegible]ныя таваравытворцам, часта [illegible] і ў масавым маштабе» дапа[illegible]раджэньню капіталізму.

[illegible]лістападаўскага пленуму [illegible]б кантрольных лічбах ад[illegible] «Абавязковай умовай па[illegible] на вёсцы зьяўляецца [illegible]не выразнай клясавай [illegible]тах работы».

ЗОЯ [illegible] выразнай клясавай [illegible] сацыяльна, павінен [illegible] КАСА—ад[illegible]ты, як прадстаў[illegible]

[illegible] складзе вяс[illegible]не для пар[illegible]ць, бо ў [illegible]яльнага [illegible]-сеяль[illegible] пра[illegible]

Кіно „Пралетар"
Ад аўторка 2 ліпеня
2 баявікі у ад[illegible]
I. ФІЛЬМ БЯ[illegible]
Чалавек з кіно-[illegible]
у 6 частках
II. ГАРОЛЬД ЛЕЙД
У АРЫГІНАЛЬНАЙ КАМЭДЫІ
МУІ у РАІ
у 3-х частках
Пачатак—а 8 гадз. Каса—ад 6 гадз.
Каса адкрыта ад 6 гад[illegible]
ад аўтор[illegible]
2-га ліпен[illegible]

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск

гутнасьць іх гаспадарак і г. д. Самым характарным у гэтых адносінах зьяўляецца магутны факт:

У Х. раёне пераліс прышлося паўтарыць тры разы, бо першыя два пераліс**ы** не давалі правільнага адлюстраваньня фактычнага становішча гаспадарак камуністых. Як паказала зробленае потым з боку ЦК КП(б)Б абсьледваньне гэтай арганізацыі, у ёй дамінуючую ролю адыгрывалі члены партыі, якія мелі кулацкія гаспадаркі...

Пасобныя тыпы гаспадарак абсьледаваных камуністых зьяўляецца надзвычайна характэрнымі з пункту погляду выяўленьня як сацыяльных сувязяй вясковых камуністых, так і таго, «куды многія з іх растуць». Падамо некалькі прыкладаў:

Х. мае 9 дзесяцін зямлі, невялікі садзік, акрамя таго, наймае зямлю у сялян; кошт жывёлы вызначаецца ў 427 р., служыць прыказчыкам у каапэратыве і знаходзіцца ў сям'і са сваім бацькай, які тут-жа займаецца... прыватным гандлем. Гэты камуністы, відавочна, ня дрэнна праводзіць «зрошчваньне» каапэрацыйнага і прыватнага гандлю.

У. жыве на хутары, мае 10 дзесяцін зямлі, жывёлы на 450 р., пабудоў на 2.500 р., сам загадвае школай, у сям'і ёсьць, акрамя таго, некалькі членаў сям'і «братоў і сясьцёр», таксама настаўнікаў, г. зн. яны прыцягваюць у гаспадарку значны прыбытак з боку і, такім чынам, дапамагаюць перарастаньню сваёй гаспадаркі ў больш заможную.

Ц. мае 8 з паловаю дзесяцін зямлі, жывёлы на 400 руб., сад, пабудовы коштам у 1.500 руб. і акрамя ўсяго зьяўляецца ўласьнікам млыну, які дае яму значны прыбытак.

Трэба адзначыць, што вышэй апісаныя гаспадаркі з пункту погляду клясыфікацыі гаспадарак, якая да іх ужываецца, ня гледзячы на поўную іх заможнасьць не зьяўляюцца ўсё-ж кулацкімі гаспадаркамі.

Для характарыстыкі кулацкіх гаспадарак вясковых камуністых падамо наступныя прыклады:

Д. Г.—гаспадарку мае: 28 дзес. зямлі, тым ліку пахаці—22 дзес., пасеў склаў 19 дзес. Ёсьць сад з 20 дрэў, 3 ко[illegible]ніней і г. д. Усяго [illegible]таксама мала[illegible]рамысловы [illegible]0 руб. [illegible]руб [illegible]30

пасеву 9 дзес., 2 коняй, 5 галоў рабочае жывёлы і інш.—усяго жывёлы на 465 р. Ёсьць таксама: малатарня (120 р.), машына для ачысткі насеньня (60 руб.), сячкарня (30 руб.), усяго інвэнтару на 1.288 р. Пабудовы ацэньваюцца ў 400 руб. Ёсьць «прамысловы інвэнтар», г. зн., млын, коштам у 1.000 руб., прыбытак ад якога, паводле ўласнай ацэнкі гаспадара, складае 700 руб. Між тым с.-г. падатак за бягучы год складае ўсяго толькі 13 р. 57 к.

Ш. І.—член партыі з 1928 г. Ёсьць зямлі 24 дзес., пасеву—12,75 дзес., жывёлы на 1.095 р., малатарня і інш. інвэнтару—на 487 р. Пабудовы ацэньваюцца ў 7.730 руб. Прыбытковасьць гаспадаркі вызначана падатковай камісіяй у 1.117 руб. Заплаціў с.-г. падатку 113 р. 87 к. Член сельсавету.

Магчыма, што калі разгледзець паказаныя гаспадаркі на фоне эканамічна больш заможнага раёну, чым Беларусь, то яны акажуцца гаспадаркамі сераднякімі. Аднак, высокі ўзровень эканамічнай магутнасьці гэтых гаспадарак, наяўнасьць у іх эксплёатацыі і г. д. характарызуюць іх, як гаспадаркі кулацкія.

Для выразнасьці трэба паказаць, што групоўка гаспадарак зроблена паводле схэмы, прынятай для вылічэньня клясавага складу савецкай вёскі наогул *) Ніякіх зьмен у гэтай схэме, з пункту погляду асаблівасьцяй беларускай вёскі, мы не рабілі. Гэта дае магчымасьць атрыманыя даныя па ВССР супаставіць з аналёгічнымі данымі на іншых раёнах СССР, а таксама з данымі па клясавым складзе беларускай вёскі наогул.

Для большай выразнасьці малюнку мы прытрымліваемся агульна пашыранай і ўжо усьвядомленай наступнай 4-хчленнай групоўкі гаспадарак: пралетарская, **) паўпралетарская (беднякі), просты таваравытворца (сераднякі) і дробная капіталістычная гаспадарка (кулакі).

У агульным выніку атрымліваем наступную структуру сацыяльнага складу камуністых-сялян БССР (побач падаем для супастаўленьня і даныя дынамічнага перапісу беларускай вёскі адносна клясавага складу сялян БССР у цэлым):

Клясавыя групы	Удзельная вага пасобных груп	
	Серот гаспадарак камуністых	Серот гаспадарак сялянства наогул
Пралетарыят	15,91	6,5
Поўпралетарыят.	23,72	24,9
Простыя таваравытворцы	58,85	64,5
Дробна-капіталіст.	1,52	4,1

З паданых даных вынікае, што сярод абсьледаваных камуністых, як і сярод усяго сялянства БССР, пераважаюць сераднякія гаспадаркі (больш паловы). Але акрамя таго, з гэтых даных мы бачым, што ўдзельная вага сераднякіх гаспадарак і асабліва кулацкіх сярод камуністых значна ніжэй, чым сярод сялянства наогул. За кошт паніжэньня ўдзельнае вагі гэтых гаспадарак значна павышаецца сярод камуністых удзельная вага гаспадарак пралетарскіх.

Наогул-жа сярод сялян-камуністых мы наглядаем павышэньня бядняцка-пралетарскіх элемэнтаў, што сьведчыць аб адносна правільнай лініі ўцягненьня сялян у партыю.

Наяўнасьць сярод камуністых і кулацкіх гаспадарак, хаця-б у невялікім процанце (1,52%) можа выклікаць зьдзіўленьне.

На жаль, адсутнічае дынаміка гэтых гаспадарак, таму цяжка зараз устанавіць, ці ўвайшлі ў партыю прадстаўнікі гэтай групы гаспадарак, ужо будучы кулакамі,

Чырвоная армія знаёміцца з электрасэрцам БССР

(N-скі полк на Асінбудзе)



Чырвоная армія абараняе мірнае сацыялістычнае будаўніцтва, якое шпаркім тэмпам разгортваецца па ўсёй нашай краіне. Чым мацней Чырвоная армія, чым яна лепш узброена вайсковымі і палітычнымі ведамі, тым больш упэўнена стукае молат у руках рабочага, тым спакайней працуе селянін на сваёй гаспадарцы.

Чырвоная армія павінна ведаць ад нашым будаўніцтве не толькі па дыяграмах, па толькі па газэтах, ёй трэба самой, на месцы азнаёміцца з вялікімі дасягненьнямі сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтымі днямі №-скі аршанскі полк наведаў беларускую раённую электрастанцыю імя тав. Сталіна (Асінбуд). Паход па Асінбуд прасьледваў дзьве мэты — азнаёміцца з будучым электрасэрцам Беларусі, а таксама правесьці выносьлівасьць байцоў у паходзе.

***

У паход сабраліся на трывозе. Вышлі ў 3 гадзіны ночы.

Па віцебскай шашы, не былым Екацярынінскім тракце, доўгай стужкай разгарнуліся калёны чырвоных байцоў. Да Асінбуду — 30 кілёмэтраў, мы яшчэ ня прывыклі да паходаў (гэта першы паход) і таму нас мімаволі палохае вялікая дарога, і тым больш, што сёньня-ж трэба зьвярнуцца назад.

Пасьля кожных 50 хвілін — прывал. Кніганоша разгортвае ранец з кнігамі, газэтамі. Выкарыстоўваем хоць 10 хвілін адпачынку і знаёмімся з апошнімі падзеямі.

Асабліва чырвонаармейцаў зацікавілі падзеі ў Індыі. Каля вёскі Грышкіны, мы зьвярнулі ўправа. Дзе раней была вароглая дзікім хмызьняком сьцежка, зараз шырокая, роўненькая шаша, якая вядзе на Асінбуд.

— Дык гэта ўжо блізка Асінбуд.

— А мы зусім мала стаміліся.

Сапраўды мы памыліліся, палохаючыся паходу. Трыццаць кілёмэтраў мы прайшлі нечакана хутка, без асаблівага стамленьня.

З Выдрыцы, дзе мы агледзелі часовую электрастанцыю, мы накіраваліся ў Арахі — сэрца Асінбуду. Кідаюцца ў вочы шырокія будаўнічыя работы, на фоне нізенькіх саломяных Арахоўскіх хатак — вялізныя 4-хнавярховыя цагляныя будынкі, з боку налева волатам выглядае «Гукілёт» будучай магутнай электрастанцыі, апрануты ў рыштаваньні. Над ім разьвіваецца чырвоны сьцяг перамогі.

***

На адкрытай паляны, зусім побач са станцыяй, мітынг.

Кароценькую справаздачу аб становішчы будаўніцтва робіць нам. галоўнага інжынэра тав. **Шаршнёў.** Яго справаздача — аповесьць аб тым, як гэраізм працоўных мас узьнімае векавыя цаліны і на чорным балоце будуе новае, казачнае, гіганцкае.

Толькі ў 1927 г. пачалі будаўніцтва— кажа тав. Шаршнёў, а ўжо зараз дасягнуты вялікія посьпехі: пашырана віцебская фабрыка акуляраў, будуецца фабрыка па выпрацоўцы шоўку ў Магілеве, ільна-прадзільны і бэконны камбінаты ў Воршы і г. д. Усе яны атрымаюць электраэнэргію з Асінбуду.

Што мы пасьпелі да сёньняшняга дня зрабіць? Змянілі твар балотнага масыву, правялі вузкакалейку на адлегласьці 16 кілёмэтраў, пабудавалі пасёлак, маем тры кіно-сталовыя, пошту, больніцу, лазьню, 5 чатырохпавярховых дамоў. Галоўны будынак у асноўным гатоў, засталося пабудаваць толькі яшчэ 2 аддзяленьні.

— Ці ёсьць у нас усё неабходнае для выкананьня ў тэрмін пляну будаўніцтва—пытае Шаршнёў.

— Ёсьць, — тут-жа адказвае ён. У нас ёсьць моцны партыйны калектыў з 100 чалавек, рабочы калектыў будаўніцтва ў 1.500 чалавек з вялікім энтузіязмам уступіў у сацыялістычнае спаборніцтва, мы забясьпечаны неабходнымі сродкамі (у гэтым годзе патрэбна 8 з палов. міл. руб.), ёсьць патрэбныя матар'ялы.

Аб вялікай важнасьці выкарыстаных земных багацьцяў, аб ролі Асінаўскай станцыі для прамысловасьці і с.-г. акругі гаварыў у адказным слове ваенком палка тав. **Бабкоў.**

Мы першыя, — кажа тав. Бабкоў,— атрымалі карысьць ад Асінбуду. Наш лягер ужо асьветлены электрычнасьцю. Але гэта толькі першыя вынікі. Хутка пальецца электрасьвятло ў сотні цёмных вёсак, будуць працаваць дзесяткі новых фабрычных рухавікоў.

Наш полк будзе стаяць на абароне вялікіх сацыялістычных заваяваньняў. Будуйце сьмела! Мы на варце!

Якія вывады паходу? Папершае, чырвонаармейцы ўласныма вачыма ўбачылі, што пабудова Асінбуду, гэта ня казка далёкага, а што гэта рэальная справа, якая магчыма толькі пры савецкай уладзе.

Падругое, паход выявіў выносьлівасьць нашага байца. За суткі пакрыта 65 кілёмэтраў (гэта першы паход), ня гледзячы на гэта, ніякага амаль парушэньня і адставаньня ад строю ня было.

Чырвонаармеец Р. Д.

Да ўборкі ўраджаю ў БССР

Беднота па-за межамі увагі зямельных органаў, КСУ і с.-г. каапэрацыі

Вызвалім беднату ад залежнасьці кулака пры ўборцы ўраджаю

СВАЯЧАСОВА САБРАЦЬ УРАДЖАЙ

Як нашы цэнтральныя ўстановы і арганізацыі рыхтуюцца да ўборачнай кампаніі?

Ці сапраўды зацікаўлены тыя працаўнікі, на абавязку якіх ляжыць кіраваць уборачнай кампаніяй, у хуткім і добрым правядзеньні гэтай справы? Ці зразумелы ім задачы ўборачнай кампаніі?

Матар'ял, які мы сёньня друкуем гаворыць аб тым, што рад устаноў не падрыхтаваны да ўборачнай кампаніі, не зацікаўлены ў хуткім яе правядзеньні і нават не разумеюць яе значэньня.

Ні Белсельсаюз, ні НКЗ ня здолелі, без папярэдняга азнаямленьня з «матар'ялямі і данымі, якія маюцца», даць хоць-бы агульны малюнак падрыхтоўкі да кампаніі па іх лініі. У кожнай з гэтых устаноў прышлося чуць прыблізна такі адказ:

— «У Беларусі ўборачная кампанія ня мае таго значэньня, якое яна мае, напрыклад, на Украіне. Там неабходна вельмі хутка зрабіць уборку, бо плошчы пасеваў вялікія і трэба зараз-жа зноў сеяць. У нас зусім ня так. Пасьпеем.—

Зусім зразумела, што гэткі пункт погляду на ўборачную кампанію ў БССР зьяўляецца памылковым. Сёлета мы маем задачу чым хутчэй справіцца з уборкай і абмалотам, каб яшчэ ўвосень здаць дзяржаве хлебныя лішкі, каб сваячасова засеяць азімы клін. Тое, што БССР не зьяўляецца вытворчым раёнам, зусім не гаворыць аб тым, што нам няма патрэбы сваячасова засяваць палі і здаць хлебныя лішкі. Наадварот, мы ўсімі мерамі павінны імкнуцца выкінуць на дзяржаўны рынак больш таварнага хлеба, каб яго менш завозіць з іншых раёнаў.

Зусім дарэмна некаторыя адказныя працаўнікі лічаць, што ўся справа ў «вялізарных плошчах». А дзе-ж пытаньне з дапамогай беднаце ў часе ўборачнай кампаніі? Якія-ж мерапрыемствы прымаюць зямельныя органы і с.-г. каапэрацыя, каб вызваліць беднату ад залежнасьці кулака пры ўборцы ўраджаю? [illegible] агульных фраз нічога канкрэтнага ні ў Наркамземе, ні ў Белсельсаюзе на такое пытаньне адказаць не маглі.

Трэба адзначыць, што нашы ўстановы, акрамя Белкалгассаюзу, вельмі слаба рэагуюць на неабходнасьць добрай падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Цэнтральны камітэт сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі і Белсельтрэст, гэтыя арганізацыі нават не ўяўляюць сабе добра, што яны павінны і могуць зрабіць.

Наогул, можна канстатаваць, што задачы сёлетняй уборачнай кампаніі ня зусім ясныя для адпаведных органаў і арганізацый. Яны зьвязваюць яе з асеньняй пасеўнай кампаніяй, але фактычна ніякіх спэцыяльных крокаў да хуткага правядзеньня ўборачнай кампаніі ня прымаюць.

Гэта памылка павінна быць выпраўлена ў самыя бліжэйшыя дні. Трэба разбудзіць ад сну нашы зямельныя органы і каапэрацыю. Ураджай і ў Беларусі павінен быць сабраны ў самы кароткі тэрмін. У часе ўборачнай кампаніі беднота павінна атрымаць максымальную дапамогу з боку партыйных каапэрацыйных, гоамадзкіх і савецкіх органаў.

НІЯКІХ ДЫРЭКТЫЎ

Цэнтральны камітэт сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі БССР ніякіх спэцыяльных дырэктыў адносна падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі не даваў мясцовым камітэтам. Аб гэтым між іншым толькі ўспамінаецца ў пляне правядзеньня асеньняй пасеўнай кампаніі.

У чым-жа ўсё такі вывяцца ўдзел камітэтаў узаемадапамогі ва ўборачнай кампаніі?

Асноўная дапамога,якое патрабуе беднота пры ўборцы ўраджаю, гэта працоўная дапамога. У сучасны момант камітэты ўзаемадапамогі Беларусі маюць больш 500 працоўных дружын, складзеных з вясковага актыву Зразумела, што гэткая невялікая колькасьць дружын ня зможа дапамагчы беднаце ў тым разьмеры, які нават прадугледжваўся самімі камітэтамі. На сёнешні дзень павінны быць арганізаваны 1.432 працоўныя дружыны; ёсьць-жа толькі адна пятая частка гэтай патрэбнай колькасьці.

Чым тлумачыцца невыкананьне пляну ў галіне арганізацыі працоўных дружын?

Папершае, вінаваты ў гэтым кіруючыя органы камітэтаў узаемадапамогі, якія выяўляюць мала актыўнасьці і жывога ўдзелу ў ажыцьцяўленьні данай справы.

Падругое, значная частка віны падае таксама на мясцовыя партыйныя, камсамольскія і савецкія арганізацыі, якія выяўляюць мала зацікаўленасьці ў арганізацыі працоўных дружын і слаба дапамагаюць камітэтам узаемадапамогі.

Праўда, сёлета ёсьць некаторы зрух у параўнаньні з мінулым годам—летась існавала толькі 190 працоўных дружын, —але ўсё такі трэба канстатаваць, што плян недавыкананы.

Пакуль што камітэты ўзаемадапамогі не намецілі яшчэ канкрэтных мерапрыемстваў для аказаньня дапамогі беднаце цягавай сілай. У гэтай справе, калі ня будуць у бліжэйшы час вышуканы новыя спосабы, прыдзецца дзейнічаць пастарому. Гэта значыць, што для абмалоту, напрыклад, бядняцкага збожжа трэба будзе проста наймаць коняй за рахунак камітэтаў. Праўда, яшчэ летась камітэты для практыкі арганізавалі ў Беларусі тры конныя калёны для аказаньня дапамогі беднаце цягавай сілай. Аднак, пакуль што гэта практыка ня можа быць пашырана, бо яна яшчэ ня вывучана. Камітэты ня ведаюць, ці мэтазгодна пашыраць справу арганізацыі конных калён.

Нарэшце, вялікую дапамогу беднаце закліканы зрабіць пракатныя пункты камітэтаў узаемадапамогі. Да вясны іх было 617; у веснавую пасеўную кампанію былі арганізаваны 42 новыя пракатныя пункты. Наогул, існуючая колькасьць пунктаў можа поўнасьцю абслужыць беднату. Пункты ўкамплектаваны патрэбнымі с.-г. машынамі і прыладамі, за выключэньнем машын па ачыстцы насеньня, якіх не хапае. Завоз машын на пракатныя пункты ідзе здавальняюча за выключэньнем машын па ачыстцы насеньня.

С.

„Нічога ня можам сказаць пакуль"...

На працягу трох дзён наш супрацоўнік імкнуўся высьветліць, **як Наркамзем БССР і Белсельсаюз рыхтуюцца да ўборачнай кампаніі.**

Усе яго спробы атрымаць у адпаведных адказных працаўнікоў Наркамзему і Белсельсаюзу хоць-бы агульны малюнак падрыхтоўкі да гэтай кампаніі, пі-якіх вынікаў не далі.

У Белсельсаюзе на запытальне аб тым, як наогул ідзе завоз машын, якія асноўныя недахопы ў гэтай справе, што Белсельсаюз робіць, каб с.-г. каапэрацыя ў часе ўборачнай кампаніі працавала так, каб вызваліць беднату з-над ярма кулацтва, быў атрыман такі адказ:

— Мы нічога ня можам сказаць, пакуль ня праверым усе нашы дакументы, усе матар'ялы.

У Наркам[illegible] ўборачнай кампаніі там няма. Наркамзем [illegible] спэцыяльных дырэктыў у гэтай галіне нікому не даваў. Ён апраўдваецца тым, што аб уборачнай кампаніі ўспамінаецца ў цыркуляры аб падрыхтоўцы да асеньняй пасеўнай кампаніі.

Гэтымі днямі тав. Рудаўтак тэрмінова запрасіў весткі аб тым, як ідзе падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі і якія наглядаюцца недахопы. У сувязі з гэтым усё заварушылася. Не маючы ніякіх рестак, Наркамзем тэрмінова пытаецца ў Белсельсаюзу. Апошні ў сваю чаргу тэрмінова прыступае да вышуканьня і распрацоўкі патрэбных даных.

Такім чынам, мы пакуль што і ня можам сказаць, як ідзе падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі па лініі Наркамзему і Белсельсаюзу.

Калі на мясцох арганізацыі, як'я падпарадкаваны НКЗБ і Белсельсаюзу, таксама рыхтуюцца да ўборачнай кампаніі, дык гэта кампанія напэўна ня дасьць [illegible] вынікаў, якіх мы ад яе чакаем.

К.

Распачаць сацыялістычнае спаборніцтва НА ЛЕПШУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ПАЧАТКУ НАВУЧ. ГОДУ

Лікпункт—штаб паходу за грамату

XV-ы зьезд УсеКП(б) даў выразную ўстаноўку адносна нашага культурнага будаўніцтва сваёй пастановай: **«Увязаць плян культурнага будаўніцтва з індустрыялізацыяй краіны як неадрыўную частку агульнага пляну сацыялістычнага будаўніцтва».**

Задача падняцьця культурнага ўзроўню працоўных мас, культурная рэвалюцыя адна з асноўных праблем сёнешняга дня.

Наша прамысловасьць, сельская гаспадарка, асабліва ў часе яе рэканструкцыі, пабудовы на больш высокіх тэхнічных пачатках, патрабуюць добра пісьменнага рабочага і селяніна.

Ліквідацыя няпісьменнасьці павінна заняць першачарговае месца сярод іншых пытаньняў культурнага будаўніцтва. Ліквідаваць няпісьменнасьць сярод рабочых, сярод сялян, гэта значыць палепшыць вытворчасьць на прадпрыемстве, падняць ураджайнасьць сельскае гаспадаркі.

У пераважнай большасьці пытаньнем ліквідацыі няпісьменнасьці да гэтага часу займаліся органы НКА, удзел шырокіх колаў грамадзкасьці не заўсёды магчыма было назіраць.

Неабходна павялічыць удзел савецкай грамадзкасьці ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці, прыцягнуць да гэтае справы каапэрацыйныя прафэсыянальныя і інш. грамадзкія арганізацыі, каб супольнымі сіламі дабіць цэмру, перамагчы страшэннага ворага—няпісьменнасьць.

За апошнія часы можна назіраць усё большую і большую ўвагу з боку грамадзкасьці да справы ліквідацыі няпісьменнасьці. Магілеўская акруговая канфэрэнцыя т-ва «П. Н.» абвясьціла сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да пачатку навучальнага году ў лікпунктах, большы абхоп няпісьменных лікпунктамі, лепшае выкарыстаньне грамадзкасьці. Гомель паставіў сваёй мэтай ліквідаваць няпісьменнасьць у прамысловых раёнах сваёй акругі на працягу аднаго году і праробленая праца да сёнешняга дня яскрава сьведчыць, што свае мэты Гомель дасягне. Вопыт Гомелю неабходна распаўсюдзіць на ўсю Беларусь. Вопыт Гомелю паказвае, што працу па шырокім разгортваньні ліквідацыі няпісьменнасьці магчыма разгарнуць на шырокім удзеле камсамольскіх, прафэсыянальных і каапэрацыйных арганізацый, дапамогай з боку гэтых арганізацый сродкамі і працоўнай сілай.

Пастановы XII-га зьезду КП(б)Б і IX-га зьезду савецкай БССР усклалі на НКА ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 548.000 асоб на працягу 5-ці год задача цяжкая і адказная. Вяз удзелу шырокай грамадзкасьці, без дапамогі кожнага пісьменнага, справіцца будзе з ёю нельга.

Камсамол, які зьяўляўся пачынальнікам ва ўсіх правадзімых кампаніях, у справе ліквідацыі няпісьменнасьці ён паказаў сваё жаданьне працаваць у мінулым годзе, аб чым яскрава сьведчыць культпаход. НКА упэўнен, што і ў гэтым годзе ён зойме першае месца ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці.

Асаблівая адказнасьць у гэтай справе ўскладаецца на кадры настаўніцтва гораду і вёскі—не павінна і ня можа быць ні аднаго настаўніка, які-б ня прымаў удзелу ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці. Пачатак навучальнага году набліжаецца.

Нам трэба **шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да пачатку навучальнага году,** лепшае задаваленьне падручнікамі, дапаможнікамі, сваячасовай падрыхтоўкай кадраў.

Т-ва «Ц. Н.» павінна ўзяць на сябе абавязак аб'яднаньня ўсяе грамадзкасьці навакол пытаньня ліквідацыі няпісьменнасьці, выкарыстаньня грамадзкасьці на практычнай працы, зьвяцца штабам па паходзе за грамату.

Часу да пачатку навучальнага году засталося мала, падрыхтоўку трэба распачаць зараз-жа, надаць шырокай голаснасьці перад працоўнымі аб праробленай падрыхтоўчай працы да пачатку навучальнага году лікпункту, прыцягнуць шырокія колы грамадзкасьці да практычнага ўдзелу ў падрыхтоўцы, падрыхтаваць іх да працы на лікпунктах узімку.

С. СЛОНІМ

РАШУЧА ЗЬНІШЧАЦЬ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ

Вялікай перашкодай нашага сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца няпісьменнасьць значнай часткі рабочых і сялянскіх мас нашай краіны. Шмат сродкаў траціцца савецкай дзяржавай на барацьбу з цемрай—гэтым лютым ворагам, бо буйны тэмп нашага сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе рашучага павялічэньня тэмпу ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослага працоўнага насельніцтва.

Бюджэтных асыгнаваньняў дзяржавы далёка не хапае, каб хуткім тэмпам ліквідаваць няпісьменнасьць. Толькі актыўны ўдзел у ліквідацыі няпісьменнасьці з боку савецкай грамадзкасьці, поўнае ўяўленьне сур'ёзнасьці гэтае справы шырокімі рабочасялянскімі масамі могуць дапамагчы з посьпехам выканаць тыя задачы, якія стаяць перад краінай саветаў на гэтым вучастку культурнага фронту. Навучальны год набліжаецца. На мясцох праводзіцца падрыхтоўка да пачатку заняткаў у лікпунктах. Задача ўсяе савецкае грамадзкасьці прыняць актыўны ўдзел у правадзімым сацыялістычным спаборніцтве да лепшай падрыхтоўкі пачатку навучальнага году, лепшага абслугоўваньня лікпунктамі рабочага, батрака, бедняка селяніна, калгасьніка, саўгасьніка, жанчыны-дэлегаткі.

Перад кожным савецкім грамадзянінам ставіцца задача — пісьменны навучы няпісьменнага.

Рабочы, батрак, бядняк селянін, работніца і сялянка, перажыўшыя рабства і цемру — вось хто павінен зараз у першую чаргу навучацца ў лікпункце, каб выйсьці з яго пісьменным.

Кожны культурны работнік, кожны член таварыства «Прэч няпісьменнасьць», уся савецкая грамадзкасьць павінны прыняць актыўны ўдзел у справе барацьбы з няпісьменнасьцю, шляхам збору сродкаў, арганізацыі сеткі лікпунктаў, вызначэньня асоб, якія будуць працаваць у лікпунктах, абсталяваньня памяшканьняў і г. д., і г. д.

Чым хутчэй мы ліквідуем нашу няпісьменнасьць, тым хутчэй і пасьпяховей мы вырашым усе практычныя задачы будаўніцтва сацыялізму на падставе наказаў Уладзімера Ільліча Леніна.

«Прэч няпісьменнасьць» — павінна быць агнявым лёзунгам сёнешняга дня.

А. ХАЦКЕВІЧ.

Магутная зброя санітарнай асьветы

— Менскі цэнтральны дом санітарнай асьветы зьяўляецца вялікім дасягненьнем савецкай улады,—пішуць у кнізе водгукаў дэлегаты ўсебеларускага зьезду саветаў. І сапраўды гэта так.

Цэнтральны дом асьветы—магутная зброя ў справе аздараўленьня нашага быту.

У невялікім памяшканьні вопытнай рукой абсталяваны рад вельмі цікавых аддзелаў.

Вось куток **школьніка-піянэра.** Мастацкі выкананыя макеты вельмі добра малююць паводзіны вучня-піянэра ў школе і дома.

Цікава падабраны экспанаты **аддзелу аховы маці і дзіцяці.** Яны даюць рад карысных парад маткам, як абыходзіцца з дзіцем, чым карміць яго і г. д. Макеты так добра зроблены, што часам забываеш, што яны не натуральныя, што выкананы рукой чалавека.

Адзін з самых важных і цікавых аддзелаў дому—гэта **аддзел сацыяльна-гігіенічны.** Там ёсьць экспанаты, якія прыкоўваюць увагу кожнага глядача. Вось, напрыклад, дом, занесены сьнегам. Каля ліхтара ляжыць замёрзлы п'яніца, над ім вые сабака. Макет робіць вялікае ўражаньне. Побач другі макет: чысьценькі сьветлы пакой, самавар... газета... рабочая сям'я за сталом. Тутжа другі цёмны пакой з зачыненымі дзьвярыма. Уключаем электрычнасьць. Праз зачыненыя дзьверы бачыш, як стары п'яніца крэслам б'е жонку, вакол брудныя заплаканыя дзеці.

Добра зроблены экспанаты хворых і здаровых лёгкіх, уплыву алькаголю на лёгкія чалавека, абставін, якія спрыяюць разьвіцьцю сухот і г. д.

Ва ўсіх аддзелах шмат дыяграм, плякатаў. Пры доме ёсьць бібліятэка з кнігамі на санітарна-асьветныя тэмы.

Наогул той, хто пабывае ў доме санітарнай асьветы, ня скажа, што дарэмна змарнаваў час.

За апошнія тры месяцы дом наведала звыш 2.500 адзіночак і 211 экскурсіі.

С. В.

24 мільёны р. на рэканструкцыю мэталяпрамысловасьці

На пленуме беларускага камітэту саюзу мэталістых

Гэтымі днямі ў Менску скончыўся чарговы пленум усебеларускага камітэту саюзу мэталістых.

Дырэктар Белмэталятрэсту т. **Фіш** далажыў пленуму аб выкананьні **вытворчай праграмы** за першае паўгодзьдзе 1928-29 году.

Заводы Белмэталятрэсту за паказанае паўгодзьдзе выпрацавалі прадукцыі на 5 мільёнаў 430 тысяч рублёў. Праграма выканана на 91 проц. Невыкананьне пляну выклікана, галоўным чынам, аварыяй сілавых установак на заводзе «Чырвоны Мэталісты», які вырабляе амаль 50 проц. усёй прадукцыі трэсту. Поўнасьцю выканаў плян толькі Менскі завод «Энэргія».

У капітальнае будаўніцтва ўкладзена каля 1 мільёну руб.

Тав. **Арэшка** зрабіў даклад аб ходзе **сацыялістычнага спаборніцтва** на мэталюргічных прадпрыемствах Беларусі. Па пяцігодцы ў рэканструкцыю мэталяпрамысловасьці Беларусі будзе ўкладзена каля 24 мільёнаў руб Прадукцыя мэталяпрамысловасьці павінна павялічыцца ў 3½ разы, а прадукцыйнасьць працы на 74 проц. Выкананьне гэтага пляну можа быць забясьпечана пры палепшэньні ўсёй арботы непасрэднай зацікаўленасьцю рабочых посьпехамі вытворчасьці.

Папярэднія даныя аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва па Беларусі паказваюць, што яно ўзварушыла рабочую масу і ўзьняло іх вытворчую ініцыятыву. Вось першыя вынікі: па заводзе **«Чырвоны Мэталісты»** замест 3-х малатарань у дзень выбіраецца 5, на заводзе **«Камунар»**—у бляшаным цэху нормы павышаны на 5 проц. і г. д. У красавіку прадукцыйнасьць працы рабочага на заводзе «Рухавік Рэвалюцыі» ў Гомелі павялічылася ў параўнаньні з сярэдняй гадавой нормай у мінулым годзе на 16 проц., на заводзе «Энэргія» —на 14 проц. і г. д.

Плужны цэх заводу **«Чырвоны Мэталісты»** заключыў дагавор з сялянамі, якія купляюць прадукцыю гэтага цэху. «Чырвоны Мэталісты» ўзяў на сябе абавязак палепшыць якасьць плугоў, выканаць вытворчую праграму з перавышэньнем на 20 тысяч плугоў, узьняць прадукцыйнасьць працы на 16,6 проц., зьнізіць сабекошт на 7 порц. Сялянам прад'яўлена патрабаваньне пашырыць пасеўную плошчу, узьняць ураджайнасьць і г. д.

На пленуме быў таксама заслуханы даклад тав. **Іванова** аб выніках перавыбараў фабзаўкома.

ЗАВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ПА ТЭЛЕФОНУ, ПОШТАЙ АД НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Дапамога пагарэльцам вёсні Вялікія Гарадзячыцы

БАБРУЙСК. (Наш. кар.). Пасьля пажару ў вёсцы Вялікія Гарадзячыцы на месца выехаў стрэхавы агент. Выяўлена, што пагарэлцы разьмясьціліся пакуль што ў суседніх вёсках і хутарох. Актуальна стрэха на пажару ўсклаўць ста тысяч рублёў.

Райвыканком прыняў меры да арганізацыі дапамогі пагарэльцам.

У вёсну накіравана 200 пудоў хлеба і іншыя прадукты. Райвыканком хадайнічае перад акрвыканкомам аб тэрміновым правядзеньні ніжэйпарадкаваньня ў згарэлай вёсцы.

Акстрахкасам выдана страхавая дапамога пагарэльцам у суме 39 тысяч рублёў.

Вылазка кулакоў

ВІЦЕБСК. (Наш. кар.). 23 чэрвеня ў вёсцы Прудкова, Гарадоцкага раёну, кулакі браты Капылавы, Жураў і Капылаў цяжка зьбілі старшыню малочнай арцелі «Жывёлавод» (пры камуне «Чырвоны Сьцяг») т. Купрэева Пятра. Нападаўшыя былі ўзброены рэвальвэрамі і нажамі. Усе, за выключэньнем Жураўа, затрыманы. Тав. Купрэеў актыўна працаваў па калектывізацыі ў Іванаўскім сельсавеце і змагаўся супроць кулакоў.

Вядзецца тэрміновае расьсьледваньне. Прыняты меры, каб знайсьці ўцёкшага кулака Журава.

Замах на селькора

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). 26 чэрвеня ўвечары ў вёсцы Масток, Лупалаўскага раёну, падкулачнікі Ігнаценка Міхась, былы афіцэр старой арміі, і Пракапкоў Раман арабілі замах на селькора Ігнаценку Арцёма.

У гэты вечар т. Ігнаценка вярнуўся дамой з горада, дзе ён здаваў у рэдакцыю заметку, і пашоў аглядаць лес (ён лясьнік). Азьвярэлыя падкулачнікі адабралі ў яго стрэльбу, ударылі ёю Ігнаценку па галаве, а потым нанесьлі нажом рад удараў.

Ігнаценку выратавалі прыбегшыя на шум грамадзяне. Злачынцы арыштаваны.

Перад сьвятам каапэрацыі

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). **Каапэрацыйныя арганізацыі рыхтуюцца да сьвяткаваньня міжнароднага дня каапэрацыі. Усе каапэрацыйныя магазыны будуць упрыгожаны плякатамі і лёзунгамі. Будуць праведзены сходы пайшчыкаў, дзіцячыя ранішнікі і інш.**

Сьвяткаваньне дня каапэрацыі будзе адзначана адкрыцьцём культурнай чайнай у Ветцы і 11 каапэрацыйных яслей для дзяцей беднякоў пайшчыкаў.

Абмежаваць выдачу правізіёнак

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Чыгуначнікі 3-га вучастку цягі ўзбудзілі пытаньне аб абмежаваньні выдачы правізіёнак. Кожны дзень цягнікі бываюць перапоўнены асобамі, якія скарыстоўваюць дармовыя білеты для спэкуляцыі прадуктамі. Гэтыя «дармовыя пасажыры» падрываюць хлебазагатоўкі і выклікаюць нараканьні многіх рабочых.

Вытворчасьць сіласарэзак у БССР

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). На Магілеўскім заводзе «Адраджэньне» пабудавана пробная сіласарэзка сыстэмы «Патэк». Завод марыць выпусьціць да канца гэтага гаспадарчага году 100 такіх сіласарэзак для «Моссельгадтэхзавода». У будучым гаспадарчым годзе выпуск сіласарэзак будзе пашыраны.

На непарыўны рабочы тыдзень

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У будаўнічых гаспадарчых органах абмяркоўваецца пытаньне аб пераходзе на непарыўны працоўны тыдзень. Мяркуецца перавесьці на новы мэтад работы цагельні. Пераход на непарыўны тыдзень павялічыць вырабку цэглы і дасьць працу некалькім сотням рабочых.

Падрыхтоўка да асеньняе сяўбы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). На правядзеньне асеньняй пасеўнай кампаніі адпушчана больш як 500 тысяч рублёў. З паказанай сумы будзе патрачана 440 тысяч на машыназабесьпячэньне, 35 тысяч на куплю чыстагатункавага насеньня і 11 тысяч на дадатковае абсталяваньне сельска-гаспадарчых майстэрань.

Закончылася чыстка акрстатбюро

БАБРУЙСК. (Наш кар.). 28 чэрвеня скончылася чыстка апарату акрстатбюро. Праверку прайшло 25 супрацоўнікаў, з якіх 17 пакінута на працы, 5 зьняты з працы, 3 атрымалі папярэджаньні за фармальныя адносіны да работы і інш.

Арганізаваць пры сельсаветах юрыдычныя камісіі

Сялянства павінна ведаць савецкія законы

(У парадку прапановы)

Усякаму добра вядома, што савецкія законы адбіваюць палітыку партыі і савецкае ўлады. Аб гэтым больш, чым хто, ведае нэпман у горадзе, а кулак на вёсцы. Гэтыя элемэнты ўсякімі спосабамі імкнуцца скарыстаць савецкія законы ў сваіх інтарэсах, часам пры дапамозе бязумоўна чужых нам элемэнтаў, засеўшых у нашым апараце, якія па старой яшчэ «прывычцы» кіруюць савецкімі законамі, як «дышлем». Яшчэ часта прыходзіцца чуць ад таго ці іншага апаратчыка, што «закон як дышла, куды павярнуў, туды і вышла». Некаторыя сяляне, дзякуючы наяўнасьці клясавачужога элемэнту ў савецкім апараце, лічаць, што сапраўды і савецкім законам можна варочаць так, як гэтага захоча той, што стаіць каля яго.

Чыстка савецкага апарату, бязумоўна, значна аздаровіць апарат і палепшыць правядзеньне ў жыцьцё рэвалюцыйнай законнасьці ў інтарэсах працоўных, аднак, было-б грубай памылкай думаць, што пасьля чысткі наш апарат будзе цалкам здаровы.

Для таго, каб весьці сыстэматычнае аздараўленьне савецкага апарату, барацьбу з скрыўленьнем клясава-пралетарскай лініі, патрэбен як і ва ўсіх мерапрыемствах партыі і ўлады, удзел шырокіх працоўных мас.

Найлепшаю формаю ўцягненьня працоўных мас у барацьбу за рэвалюцыйную законнасьць зьяўляюцца камісіі пры сельсаветах. Але, на жаль, ні адна з існуючых 5 сталых камісій пытаньнем рэвалюцыйнай законнасьці, азнаямленьнем і растлумачэньнем законаў савецкае ўлады не замаецца.

Тлумачыць гэта толькі тым, што камісіі гэтыя не працуюць або працуюць слаба, нельга. Тут корань зла ў тым, што культасьветныя камісіі, праводзячы культпрацу—ліквідацыі няпісьменасьці, дапамога школам і клюбная праца—ня могуць увязаць задачы ўкараненьня ведаў рэвалюцыйнай законнасьці ў гушчу працоўнага насельніцтва з іншымі сваімі задачамі.

У выніку растлумачэньня законаў сярод працоўнага сялянства не вядзецца. З большасьцю законаў, калі ня зусім, то вельмі мала знаёмы нават тыя працаўнікі, якія павінны ажыцьцяўляць іх, не гаворачы ўжо пра сялянства.

Пры хатах чытальнях існуюць юрыдычныя гурткі. Але іх вельмі мала (3-4 на сельсавет), яны часта абмяжоўваюцца толькі пісаньнем заяў.

Вось уся праца, якая вядзецца на вёсцы па ўкараненьні ведаў савецкіх законаў у працоўную масу сялянства.

У пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі на правільнае разуменьне законаў павінна быць зьвернута асаблівая ўвага.

Для гэтага трэба пры сельсаветах арганізаваць побач з ужо існуючымі іншымі сталымі камісіямі, юрыдычныя ці праўныя камісіі, якія займаліся-б пытаньнямі вывучэньня законаў, уцягвалі-б у камісіі працоўнае сялянства і распаўсюджвалі-б веды законаў сярод працоўных мас. Гэта было-б надзвычайна карысным і для сельсаветаў і для паасобных членаў сельсаветаў, паколькі яны ў абавязковым парадку павінны былі-б уваходзіць у гэтыя камісіі.

Калектыўная прапрацоўка законаў дала-б больш магчымасьці выкрываць скрыўленьні клясавай лініі і парушэньні рэвалюцыйнай законнасьці.

П. ЯГОЛДЗІК.

Калгасы Беларусі рыхтуюцца да ўборкі

1.000 бядняцкіх гаспадарак атрымаюць дапамогу

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі Белкалгассаюзам ужо распачата. Выпісаныя ўборачныя машыны амаль усе паступілі на месца. Калгасы атрымалі 85 жнявярак, 92 касілкі і 29 малатарань.

Малатарні накіраваны ў калгасы, якія маюць трактары.

Наогул, трэба сказаць, што калгасы ўборачнымі машынамі забясьпечаны поўнасьцю.

Калгасам дана заданьне закончыць уборку да 1-га верасьня з тым, каб зараз-жа прыступіць да абмалоту. Прымаючы пад увагу, што новыя калгасы ня здолеюць убраць ураджай да 1-га верасьня, гэты тэрмін ім працягнут да 15 верасьня.

Беларускія калгасы павінны ў часе ўборачнай кампаніі аказаць значную дапамогу сялянскай беднаце. Калгасам дана заданьне дапамагчы цягавай сілай пры ўборцы і малацьбе 1000 бядняцкім гаспадаркам. Акрамя гэтага, калгасы павінны рамантаваць сялянскі інвэнтар у сваіх майстэрнях. Гэта дапамога будзе давацца за невялікую плату. Зусім дармовую дапамогу атрымаюць самыя бедныя гаспадаркі.

У канцы мая Белкалгассаюзам быў высьвятлены балянс таварнасьці па калгасах. Было памечана да здачы калгасамі дзяржаве 12.480 цэнтнэраў збожжа. У жніўні месяцы калгасы павінны здаць 1.650 цэнтнэраў збожжа; рэшта збожжа падлягае здачы да 1 кастрычніка. Акрамя збожжа, калгасы здад

Праверка работы Менскіх установаў

Як выконваецца пастанова НК РСІ

Учора ў Менску пачалася праверка выканаўня ўстановамі пастановы калегіі НК РСІ, выданай 6 сьнежаня 1928 году, аб прыманьні і абслугоўваньні наведвальнікаў ва ўстановах БССР.

Адзначаная пастанова прадугледжвала ажыцьцяўленьне ўстановамі раду мер па палепшаньні абслугоўваньня наведвальнікаў. Акрыванкомам і іншым арганізацыям запрапанавана было, напрыклад, абмеркаваць мэтазгоднасьць і магчымасьць нераводу некаторых гарадзкіх устаноў цалкам на вячэрнюю працу два-тры дні ў тыдзень.

Установы, якія па родзе сваёй дзейнасьці маюць шырокі кантынгэнт наведвальнікаў з рабочай масы, павінны былі практыкаваць пасылку час ад часу сваіх адказных працаўнікоў для дзяжурстваў на больш буйныя прадпрыемствы. Тое самае павінны былі рабіць установы, якія абслугоўваюць сялянскія масы.

Усім установам было запрапанавана вылучыць патрэбную колькасьць працаўнікоў, якія-б пісалі наведвальнікам заявы.

Пастанова РСІ прадугледжвала яшчэ рад мерапрыемстваў, як напрыклад, вывешваньне абвестак каля уваходаў ва ўстановы, аб парадку і гадзінах прыёму наведвальнікаў, забесьпячэньне памяшканьня, дзе чакаюць наведвальнікі, адпаведнай мэбляй, вызначэньне пэўнага тэрміну выкананьня для спраў і г. д.

У суботу 29 чэрвеня ў РСІ адбыўся сход таварышоў, якія выдзелены бюро скаргаў для правядзеньня праверкі адзначанай пастановы. Учора раніцой праверка пачалася. У ёй удзельнічаюць 43 чалавекі дабравольцы-рабочыя, члены гарсавету і лёгкія кавалерыстыя.

Правяраецца 15 менскіх устаноў, сярод якіх: Наркамзем, Наркам. Аховы Здароўя, Белсамрамсаюз, ВСНГ і інш.

Брыгадзіры разышліся па ўстановах а 8 гадз. 30 хв. раніцой, каб упэўніцца ў тым, ці своячасова супрацоўнікі ўстаноў зьяўляюцца на працу.

Бюро скаргаў лічыць, што праверка працянецца 1 тыдзень.

Ад камісіі РСІ па чыстцы Акрстраху

Прыступіла да работы камісія РСІ па чыстцы асабістага складу апарату Менскага акрстраху.

Склад камісіі па чыстцы зацьверджаны наступны: старшыня—прадстаўнік РСІ тав. **Курціх**, члены—т. т. **Гарміза** (рабочы абутковай фабрыкі), **Гольдман** (работніца 1-й друкарні), **Казлоўскі** (рабочы чыгункі), **Відасаў** (адміністрацыя акрстраху) і **Чарняўскі** (мясцоў).

Камісія просіць усе дзяржаўныя і грамадзкія ўстановы і арганізацыі, а таксама рабочых і служачых прыняць актыўны ўдзел па чыстцы апарату акрстраху шляхам падачы пісьмовых і вусных заяў аб усіх фактах цяганіны, бюракратызму і скажэньня клясавай лініі, шкодніцтва і дыскрэдытацыі ўлады.

Вусныя скаргі і заявы прымаюцца старшынёй камісіі тав. Курцікам у памяшканьні рэдакцыі газэты «Чырвоная Зьмена» (вул. Карла Маркса, дом № 38) ад 10 да 12 гадзін дня. Акрамя гэтага ўстаноўлены наступныя дзяжурствы членаў камісіі па чыстцы: у панядзелак, 8 і аўторак, 9 ліпеня дзяжурыць тав. **Гольдман**, у сераду і чацьвер 10 і 11 ліпеня дзяжурыць тав. **Гарміза**, у пятніцу, 12 ліпеня, дзяжурыць тав. **Курцін**. Вышэйпаказаныя дзяжурствы будуць адбывацца ў памяшканьні рэдакцыі газэты «Чырвоная Зьмена» ад 6 да 8 гадзін увечары.

Пісьмовыя заявы і скаргі насылаць: Акр. РСІ—акруговай камісіі па чыстцы ці на ім старшыні камісіі тав. **Курціка**.

Першае адкрытае пасяджэньне камісіі па чыстцы апарату акрстраху адбудзецца ў нядзелю, 14 ліпеня, а 6-й гадзіне вечару, у памяшканьні клюбу друкароў (Ленінская вуліца).

Камісія акр. РСІ па чыстцы

У сельска-гаспадарчую акадэмію будзе прынята звыш 400 чалавек

Адкрываюцца новыя аддзяленьні

З 1-га чэрвеня пачаўся прыём заяў на ўсе факультэты і аддзяленьні Беларускай сельска-гаспадарчай акадэміі. Прыём заяў канчаецца 5-га жніўня. У Акадэміі існуюць 4 факультэты: агранамічны, мэліярацыйны, лясны і зямляўпарадчы.

Да гэтага году на агранамічным факультэце існавалі 3 сэкцыі: эканамічная сэкцыя, якая рыхтуе спэцыялістых па арганізацыі сельскае гаспадаркі, расьлінаводчая сэкцыя, якая рыхтуе агранамаў-расьлінаводаў і зоа[illegible] агранамаў-зоа[illegible]кіў.

З бягучага навучальнага году на аграфаку адкрываецца **аддзяленьне па арганізацыі буйное гаспадаркі**, якое будзе рыхтаваць кіраўнікоў саўгасаў і калгасаў. Усяго на **аграфак** сёлета будзе прынята 200 асоб.

На **мэліярацыйным** факультэце існавалі два аддзяленьні: гідратэхнічнае — па падрыхтоўцы спэцыялістых па асушэньні балот, і культуртэхнічнае, якое рыхтуе спэцыялістых на культуры балот. З бягучага навучальнага году адкрываецца яшчэ **тарфянае аддзяленьне**. Усяго на мэліяфак будуць прыняты 94 асобы.

На **лясны факультэт** будуць прыняты ў наступным годзе 3[illegible] асоб. **Зямляўпарадчы факультэт** рыхтуе каморнікаў. Усяго на гэты факультэт будзе прынята сёлета 60 асоб.

У наступным навучальным годзе будзе выдана каля 1000 стыпэндый па 32 руб. у месяц кожная.

Студэнты за ваенный вучобай

(№-скі полк Беларускай дывізіі)

Перад асобнай ротай са студэнтаў БДУ пастаўлены былі тры галоўныя заданьні: **стралковая**, страявая трэніроўка і тактычная падрыхтоўка.

Добрая актыўнасьць студэнтаў і жаданьне вучыцца служаць гарантыяй таго, што яны справяцца са сваімі задачамі.

Зараз на працягу тыдня студэнты дабіліся належнай страявой выпраўкі, добра навучыліся сьпяваць ваенныя песьні, што адразу ніяк ня выходзіла.

Шырока разгарнулася па-зашкольная праца: арганізаваны дзьве групы па апрацоўцы пастаноў XVI партканфэрэнцыі. Студэнты прымаюць удзел у па-зашкольнай працы і ў падразьдзяленьнях.

Пачала выпускацца штотыднёвая газэтка, якую апрацоўваюць белапаўцы: Васіль Каваль, Чарнушэвіч, Салагуб і інш. Трэба адзначыць вельмі добрую дысцыплінаванасьць студэнтаў.

А. КЛЮТКО.

МЕНСК

У Прэзыдыуме ЦВК БССР

Склад нацкамісіі ЦВК БССР

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў наступны склад Нацыянальнай Камісіі ЦВК БССР т. т. **Хацкевіч** (старшыня), **Бэйлін**, **Рыжоў**, **Сташэўскі**, **Унароўскі**, **Дубаўцоў**, **Ашаровіч**, **Будзін**, **Думс**, **Бучукас**, **Баліцкі**, **Васілевіч** (вайсковец), **Стасевіч**, **Галавач**.

Нарады па савецкім будаўніцтве

У мэтах разгортваньня масавай работы саветаў акруговым выканаўчым камітэтам даручана практыкаваць пэрыядычнае скліканьне раённых і акруговых нарад па савецкім будаўніцтве. Гэтыя нарады павінны склікацца 2 разы ў год. Нарады складаюцца са сталых работнікаў, выканкомаў, членаў прэзыдыумаў выканаўчых камітэтаў, загадчыкаў аддзелаў, інспэктароў, інструктароў АВК, вылучэнцаў—членаў саветаў і выканкомаў і іншых прадстаўнікоў савецкіх і грамадзкіх арганізацый. Нарады абмяркоўюць усе пытаньні арганізацыйна-масавай работы саветаў.

Зьмены ў кодэксе аб шлюбе і сям'і

Зацьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР аб зьменах у кодэксе законаў аб шлюбе і сям'і. У шлюб могуць уступаць асобы ад 18 гадоў. У выключных-жа выпадках акруговыя выканаўчыя камітэты могуць дазволіць уступаць у шлюб асобам ад 16 гадоў.

Член двара, які па пастанове суду, павінен плаціць аліменты, можа выдзеліцца з двара толькі пасьля таго, як двор паведаміць аб гэтым тую асобу, якой прысуджаны аліменты. Калі двор утоіць факт выдзелу, то аліменты ў гэтым выпадку спаганяюцца судом з маемасьці ўсяго двара.

Гэрої працы

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў надаць роднасьць гэрояў працы т. т. **Захарынскаму**, Апанасу Яфімавічу і **Дымнікаву**, Янку Рыгоравічу.

Тав. **Захарынскі**, А. Я.—рабочы папяровай фабрыкі «Чырвоная Зорка», 69 год, працуе на фабрыцы 42 гады. Навучаў рабоце маладых рабочых. Мае заслугі перад Савецкай уладай.

Тав. **Дымнікаў**, Я. Р.—рабочы гуты «Праца», 56 год, працуе на вытворачасьці звыш 40 год. Прымаў удзел у забастоўках дарэвалюцыйнага часу, за што ў 1910 годзе атрымаў воўчы пашпарт. Зараз прымае актыўны ўдзел у справе падняцьця вытворчасьці.

Падрыхтоўка да Ніжгародзкага кірмашу

Беларускія гандлёва-гаспадарчыя арганізацыі пачалі рыхтавацца да чарговага Ніжгародзкага кірмашу.

Беларуская саматужная каапэрацыя [illegible] на 2.500.000 руб.

Выдача цукру для варэньня

Праўленьне МЦРК пастанавіла з 3-га ліпеня пачаць выдачу цукру пайшчыкам для варэньня акрамя цукру, які выдаецца па норме. Кожны пайшчык атрымае на 1 кілё цукру на едака па талёну № 81.

****

Пабудуем самалёт і танк

На выклік насьценгазэты ЦВК Бел. («Зьвязда» № 89), рэдкалегія насьценгазэты «Чырвоны Сьцяг» Мяжанскай ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ, Мяжанскага раёну, Віцебскай акругі, уносіць на пабудову самалёту і танку—26 руб. 70 к.

Выклікаем усе насьценгазэты сельскіх мясцовасьцяй Гарадоцкага, Язерышчанскага, Сіроцінскага, Сеньненскага і Бешанковіцкага раёнаў, Віцебскай акругі, пасьледаваць нашаму прыкладу.

Як будзе сьвяткавацца дзень каапэрацыі ў Менску

У пачатку будучага тыдня ў садзе «Прафінтэрн» адбудзецца ўрачысты сход каапэрацыйнага актыву, прысьвечаны міжнароднаму дню каапэрацыі.

У садзе «Прафінтэрн» арганізуецца таксама вялікае гуляньне для пайшчыкаў і іх сем'яў. У садзе наладжваецца дармовая лётарэя для пайшчыкаў, якія ўнесьлі поўнасьцю дыфэрэнцыраваны пай, кніжны базар, эстрадныя выступленьні і г. д.

Па прафсаюзных садох і на буйных прадпрыемствах за час з 4 па 10 ліпеня будуць арганізаваны вечары, прысьвечаныя міжнароднаму дню каапэрацыі.

Страхкаса выкрыла 1000 сымулянтаў

96 дзён водпускаў у месяц на 100 застрахаваных

За мінулы год праз доктарскія кансультацыі пры амбуляторыях Менску прайшло каля 23 тысяч чал. Усе водпускі звыш 5 дзён праходзілі праз доктарскія кансультацыі. Высьветлілася, што каля 5.500 чал. «хворых» зусім здаровыя і ня маюць патрэбы ў водпусках. Абсьледавана дома 9.800 чал. Не аказалася дома 11 проц. «хворых» —1.062 чал.; за работай знойдзена 47 чал. Ёсьць выпадкі, калі гэткія «хворыя» атрымлівалі водпуск, а потым працавалі ў сябе дома. 2 «хворыя» знойдзены п'янымі. Адзін з рабочых зрабіў сабе штучныя балячкі на руце і такім чынам на працягу многіх месяцаў атрымліваў водпуск. Другі рабочы на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» сьвядома апальваў руку кіслатой.

У 1926-27 годзе па Менскай страхкасе на 100 застрахаваных прыходзілася 79 дзён водпускаў у месяц, у 1927-28 годзе—74 дні. Але, пачынаючы з кастрычніка м-ца пасьля рэарганізацыі доктарскага кантролю колькасьць адпускоў расьце з кожным месяцам і зараз складае каля 96 дзён у месяц на 100 застрахаваных.

Павялічэньне ліку адпускоў значна пагоршыла фінансавае становішча страхкас.

****

СУД

„Каханьне" кулака

Гаспадарка кулакоў Яна і Ільлі Закраўскіх лічыцца першаю ў в. Хвойніцы. Бабруйскай акругі. Батрачкай служыла ў іх маладая, 18 гад. дзяўчына Марфа Сокалава. Кулаку Я[illegible] мала было эксплёатаваць [illegible]ну, захацеў пакарыстацца [illegible] яшчэ і яе целам. Ён п[illegible]ваўся вельмі закаханым у Марфу, абяцаў з ёю жаніцца і такім чынам угаварыў яе ўступіць з ім у палавыя зносіны. Але «кахаў» кулак Марфу толькі да тэй пары, пакуль апошняя запяжарыла. Як толькі кулак даведаўся аб цяжарнасьці Марфы, увесь пыл яго «каханьня» рантам зьнік. Ён захацеў пазбавіцца ад Марфы і будучага дзіцяці. Для гэтай мэты ён падгаварыў брата Ільлю, якому заявіў, што пазбаўленьне ад Марфы таксама і ў яго інтарэсах, бо аліменты прыдзецца плаціць з агульнай гаспадаркі.

Абодвы кулакі, узброеныя сякерай, цёмнаю зімоваю ноччу падкраліся да соннай батрачкі і нанесьлі ёй некалькі ўдараў сякерай па галаве. Каб замесьці сьляды, забойцы кінулі труп у студню. Так скончылася «каханьне» кулака...

Бабруйскі акруговы суд прыгаварыў забойцаў да пазбаўленьня волі са строгай ізаляцыяй: Яна Закраўскага на 10 год і Ільлю Закраўскага на 8 год і пазбавіў іх у правох першага на 5 год, а другога на 3 гады.

Вярхоўны суд, куды кулакі скардзіліся на «няправільны» прысуд, пакінуў у моцы прыгавар акруговага суду.

В.

У Калегіі Наркамасьветы

Падрыхтоўка батракоў і рабочых у ВНУ

Калегія Наркамасьветы пастанавіла сёлета адкрыць пры факультэце права і гаспадаркі ВДУ падрыхтоўчыя курсы, на якія будуць прымацца выключна работнікі візавой каапэрацыі з рабочых і батракоў. Аплату пэдагагічнага пэрсаналу бярэ на сябе НКА. На курсах будзе ўстаноўлена 25 стыпэндый па 50 руб., якія будуць выдавацца Белкаапсаюзам.

На дапамогу калектывізацыі

Адчыненьне тэхнікуму калектыўнага земляробства

У зьвязку з апошняй пастановай ЦВК і СНК СССР аб дапамозе калектыўным гаспадаркам, калегія Н. Кам. Асьветы даручыла Беларускай сельска-гаспадарчай акадэміі прапрацаваць у адпаведным напрамку структуру акадэміі. Калегія прызнала неабходным адкрыць сёлета пры акадэміі факультэт калектыўнай гаспадаркі. Акрамя гэтага прынята пастанова аб адкрыцьці новага с.-г. тэхнікуму калектыўнага земляробства.

Прадстаўнік БССР ва ўсесаюзным савеце па тэхнічнай асьвеце

Калегія НКА вылучыла тав. **Лысова** прадстаўніком БССР у савет па садзейнічаньні тэхнічнай асьвеце пры ВСНГ СССР.

Усебеларускі зьезд транспартнікаў

У суботу ў памяшканьні дому Чырвонай армії адкрыўся 9-ты ўсебеларускі зьезд транспартнікаў. У парадку дня зьезду даклад прадстаўніка ЦК саюзу тав. Цімафеева, даклад цэнтральнага праўленьня, даклад праўленьня Заходніх чыгунак, даклад Белдзяржтрансу і Аўтадору аб пяцігодцы і выбары ЦП саюзу. Ужо заслуханы даклады ЦК і цэнтральнага праўленьня саюзу.

60.000 пар цёплага абутку

Беларуская саматужна-прамысловая каапэрацыя пачала шыць цёплы абутак (бурачвага) на лямпы. Такі абутак карыстаецца вялікім попытам ня толькі ў БССР, але і ў гарадох іншых рэспублік.

Сёлета выраб цёплага абутку будзе значна пашыраны. Усяго саматужная каапэрацыя мяркуе сёлета выпусьціць 60.000 пар цёплага абутку, з якіх 30.000 пар атрымае беларуская спажывецкая каапэрацыя.

Звальненьні за парушэньне прадпісьцяў

Наркампрацы выдаў пастанову аб тым, што звальненьне супрацоўнікаў за парушэньне правіл унутранога распарадку і парушэньне прадпісьцяў у дзяржаўных установах робіцца адміністрацыяй без папярэдняй згоды з РКК.

Курсы па вапнаваньні глебы

Менскі акраз адкрыў кароткатэрміновыя 7-мідзённыя курсы - кампэрэнцыі па падрыхтоўцы работнікаў па вапнаваньні глебы. На курсах займаецца 40 чалавек — загадчыкаў саўгасамі і агранамаў.

****

Былы ўласьнік на службе ў ЦРК

Былы ўласьнік буфэту на ст. МББ чыг. зараз нейкім чынам прыняты на службу ў якасьці загадчыка сталоўкай № 6.

Між іншым, гэта ўжо ня першае зьявішча. Нядаўна быў зьняты з работы па заяве рабочага гр-н Таўбкін (былы ўласьнік на Ляхаўцы 300 дзесяцін зямлі). Ён працаваў у гандлёвым аддзеле праўленьня МЦРК.

Да якога часу МЦРК будзе прымаць на службу былых уласьнікаў?

РСІ, зьвярні ўвагу! **РАБОЧЫ.**

Зьезд упаўнаважаных Сампрамкаапэрацыі
— Менскай акругі —
адкрываецца сёньня, 2 ліпеня
У ПАМЯШКАНЬНІ КЛЮБУ САМАТУЖНІКАЎ (Раваўская 13)
роўна а 7 гадз. увеч.
Пасяджэньне фракцыі зьезду адбудзецца там-жа а 5 гадз. увеч.
Мандаты выдаюцца ў памяшканьні Мен. аддзяленьня 2 ліпеня з 10 гадз раніцы

СПОРТ

Перад двухтыднёвікам фізкультуры у прафсаюзах БССР

(На нарадзе старшынь акрсаветаў фізкультуры і прадстаўнікоў акрпрафбюро)

Нарада, якая адбылася пры ЦСПСБ, заслухала даклад т. **Смарчкова** аб правядзеньні двухтыднёвіка фізкультуры ў прафсаюзах Беларусі.

— Задача двухтыднёвіку фізкультуры,—кажа тав. Смарчкоў,—прасунуць фізкультуру ў рабочыя масы. У двухтыднёвіку павінна прымаць удзел уся прафсаюзная маса, тая маса, якая да сёньняшняга дня ня ўцягнута ў фізкультуру. На мясцох прафсаюзныя арганізацыі і АСФК павінны зрабіць усё магчымае, каб двухтыднёвік фізкультуры стаў масавым сьвятам.

Двухтыднёвік фізкультуры павінен зьявіцца праверкай працы ў фізкультурных гурткох. Атрады лёгкай кавалерыі павінны таксама адыграць не малую ролю ў двухтыднёвіку. Ім трэба праверыць, як працуюць гурткі фізкультуры.

У двухтыднёвік фізкультуры трэба шырока дапамагчы вясковым фізкультурнікам у падрыхтоўцы да сялянскай спартакіяды.

Па дакладу т. Смарчкова разгарнуліся жывыя спрэчкі. Выступалі прадстаўнікі ўсіх округ, прадстаўнікі ЦСПСБ і ВСФКБ.

Тав. Леў (ВСФКБ) адзначыў: «Нам трэба ўзварушыць усю масу; зьвярнуць больш увагі на ўцягненьне дарослых рабочых у рады фізкультурнікаў, праверыць клясавы твар нашых гурткоў.

— Нядбайна адносяцца да справы фізкультуры ЦП саюзаў,—кажа т. **Аверын** (ЦСПСБ). Яны нават не зьявіліся на нараду. ЦП саюзам даны месяц таму назад паказаньні аб двухтыднёвіку, але практычна нічога ня зроблена.

Як месцы рыхтуюцца да сялянскай спартакіяды

Нарада заслухала некалькі дакладаў з месц аб падрыхтоўцы да спартакіяды сялянскіх фізкультурнікаў.

— Усе акратары райсаветаў фізкультуры—кажа т. **Янубоўскі** (Віцебск) добра азнаёміліся з палажэньнем аб сялянскай спартакіядзе. У раёнах наглядаецца зацікаўленасьць і жаданьне ўдзельнічаць у спаборніцтвах.

Праводзяцца выезды ў раёны, дана некалькі ўказаньняў у пісьмовай форме як па лініі АСФК, так і па намсамольскай лініі. Адпушчана ўжо 600 рублёў.

Дзянна, што інструктары фізкультуры не прымацаваны да раёнаў. Між іншым хаты-чытальні і другія культурныя ўстановы пакуль што нічога ня робяць для падрыхтоўкі да спартакіяды.

—Падрыхтоўка пачалася са спазьненьнем,—кажа тав. **Кузьнацоў** (Магілеў).—Зараз мы пасылаем актыў фізкультурнікаў у вёскі. Некаторыя гарадзкія гурткі матар'яльна дапамагаюць вёсцы.

Заслухаўшы даклады з месц, нарада прыняла рад практычных прапаноў аб хутчэйшай падрыхтоўцы да спартакіяды аб дапамозе вясковым гурткам фізкультуры і іншае.

Паведамленьні

ДА ВЕДАМА ЭКСКУРСАНТАЎ МОПР'у

Менакругком МОПР'у даводзіць да ведама ўсіх ячэек Мопр'у, што білеты на агульна-гарадзкую інтэрнацыянальную экскурсію Мопраўскага актыву 7-га ліпеня, можна атрымаць у райвыкамах МОПР'у з 3-га ліпеня штодзённа з 7 да 1 г. веч.

АК МОПР'у.

— Праўленьне Фрунзаўскага райпрафтаварыства ў сераду 3 ліпеня 1929 г. 7 гадз. увечары ў памяшканьні Фрунзаўскага райкому, склікае пленум райпрафа праўленьня разам з рэвізійнай камісіяй-райбюро і старшынямі прафтаварыстваў.

У парадку дня:
1. Вынікі веснавой пасеўнай кампаніі.
2. Аб асеньняй пасеўнай кампаніі.
3. Выбары члена ў акрсавет.
4. Арганізацыйныя пытаньні.

Явка на пленум членаў і кандыдатаў райпрафпраўленьня і рэвізійнай камісіі абавязкова без спазьненьня.

— Для правядзеньня дакладаў на прадпрыемствах «Аб міжнародным дні каапэрацыі» на 4, 5 і 6 ліпеня г.г., Фрунзаўскім райкомам КП(б)Б вылучаюцца наступныя т. т. 1) Платун, 2) Ярмакоў, 3) Макарэвіч, 4) Чалядзінскі, 5) Ліўшыц, 6) Калмык, 7) Кучынскі, 8) Табайнік, 9) Фрыкман, 10) Баліцкі, 11) Слонім, 12) Вайнэр, 13) Шукевіч-Трацьцякоў, 14) Масюкоў, 15) Аўчынікаў, 16) Адамовіч, 17) Філатаў, 18) Прафэрансаў, 19) Рабіновіч, 20) Літвіновіч, 21) Дукшт, 22) Даічкоўскі, 23) Розін (ЦСПСБ), 24) Гравіт, 25) Гурскі.

— Дом Асьветы.—Сёньня 2 ліпеня—роўна а 7-й гадз. увеч. адбудзецца адчынены сход ячэек КП(б)Б: Працасьветы, НКАсьветы, БАН ІНДІ з наступным парадкам дня: а) Абгаварэньне плану асеньняй-пасеўной кампаніі ў падшэфным о-саўеце.

Яўка абавязкова.

Запрашаюцца ўсе асьветнікі г. Менску.

— Сад Асьветы. Сёньня вялікае гуляньне ў садзе, ніно «Доктар Джэк». Іграе духавы аркостр, розныя гульні.

Білеты, якія праданы на 29 чэрвеня, маюць сілу. Пачатак 6 гадз.

— БДУ. Сёньня, 2 ліпеня, а 6 гадз адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б Праўгасу БДУ у 41 ауд. У парадку дня прапрацоўка матар'ялаў па правядзеньні чыстні партыі.

— У сераду, 3 ліпеня, роўна а 7 гадз. увечары, у памяшканьні дому працасьветы адбудзецца дэлегацкі сход беларускай і расійскай групы Фрунзаўскага раёну.

Яўка ўсіх дэлегатак абавязкова.

Запрашаюцца таксама дэлегаткі дэле гарадзкіх сходаў нарваркаў і меншыя.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

СЁНЬНЯ, аўторак 2 ліпеня
ДЗЯРЖЦЫРК
ПЕРШЫ РАЗ У БССР
Першая гастроль пепшага расійскага муштравальніка
Уладзімера ДУРАВА (малодшага)
Пляменьніка трагічна загінаўшага Анатолія Анатоліевіча ДУРАВА.
СУСЬВЕТНАЯ МУШТРОЎКА СОН ПАЛЯЎНІЧАГА ГАЛУБЫ-АРТЫСТЫЯ
БОКС паміж чапавекам і славутым баксерам аўстралійскім КЕНГУРУ, бокс будзе праводзіцца на манежы цырку.
ШЭДЭЎР МУШТРОЎКІ ПЕРШЫЯ У СЬВЕЦЕ СЛАВУТЫЯ МОРСКІЯ ЛЬВЫ ВЕРА, ЛЮБА, ЛОТОС.
ЛЬВЫ музыкі, жанглеры, футбалістыя, акрабаты.
Выключная муштроўка САБАКІ жакеі акрабаты. Рэдкія экземпляры МАЛПЫ дрот, балянс, канатаходцы,
Удзел прымае ўся трупа. З прычыны гранд. праграмы, пачатак а 9 гадз. увечары.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА"
Ад аўторка, 2-га ліпеня
ПРЭМ'ЕРА
ВЫТВОРЧАСЬЦЬ БЕЛДЗЯРЖКІНО 1929 г.
Адначасова з лепшымі кіно-тэатрамі Масквы выпускаецца мастацкі фільм
„ХВОІ ГАМОНЯЦЬ"
драма ў 7 часьцях.
Рэжысэр Л. М. Малчанаў.
Апэратар М. Ф. Казлоўскі.
Мастак М. М. Літвак.
У галоўных ролях:
В. М. Полло, Г. А. Кудзелька, Н. Капралаў.
Фільм ілюструецца струнным аркестрам пад кіраўніцтвам Л. ШТЭЙНА.
Пачатак 1-га сэансу а 7½ гадз., 2-га—а 9 г., 3-га—а 10½ гадз.

Прадаюцца взлёсыпэд (мужчынскі) і БАЛАЛАЙКА.
вул. Дзяржынск., № 5, кв. 2.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі
Пашпарт Ваананінай Э., выд. Менгарміліцыяй. 1960
Чырвонаарм. кніжка выд. 33 артпалк. камсамольскі білет № 105532, спраўка ўзамен вл. біл. саюзу будаўнікоў Чунінскага А. А. 1961-1963
Мэтрычн. спраўка Новікавай Б. І., выд. Букоўскім с-с, Бранск. губ. 1964
Службовая кніжка № 17 Матылевіча І. С., выд. Заслаўск. РВК. 1965
Камсамольскі білет № 12008, чл. білет МОПР'у Булыкіна М. У. 1966-1967
Чл. білет саюзу Саўгандальслужач. № 7113 Жука А. А. 1968
Чл. кніжка Менсамрэмкрэдыту [illegible]
Біржа [illegible]
[illegible] Занц І. Я. выд. Бабруйск. АК КП(б)Б. 1972
Вайсковая кніжка Рубенчыка Я. І., выд. Менвенкомат. 1973

Тэатр „ПРАФІНТЭРН"
Аўторак 2 ліпеня 1-я гастроль Маскоўскага Тэатру Пролеткульта для членаў прафсаюзаў шэйнікаў і хімікаў
„ВЛАСЬЦЬ"
Астача білетаў у раб. касе і ў касе тэатру „Прафінтэрн" Пач. роўна а 9 гадз.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл. 2-49

Кіно-САД „Чырвоная Зорка" Ад аўторка 2 ліпеня
ПРЭМ'ЕРА! Вялікая мастацкая паста-ноўка вытворч. саўкіно ПРЭМ'ЕРА!
МЕСЯЦ ЗЬЛЕВА
па аднайменнай п'есе БІЛЬ-БЕЛАЦЭРКОЎСКАГА.
Рэжысэр А. ІВАНОЎ.
У гал. ролях—папулярныя у СССР артысткі
ЗОЯ ВАЛЕЎСКАЯ і Е. ЯГОРАВА.
2 сэансы: пачатак 1-га а 9 г. 15 м., 2-га а 10 ч. 45 м.
КАСА—ад 7 гадз. У садзе грае сімфанічны аркестр.

Кіно „Пралетары"
Ад аўторка 2 ліпеня
2 баявікі у адзін сэанс 2
I. ФІЛЬМ БЯЗ СЛОЎ
Чалавек з кіно-апаратам
у 6 частках
II. ГАРОЛЬД ЛЁЙД
У АРЫГІНАЛЬНАЙ КАМЭДЫІ
ПУІ у РАІ у 3-х частках
Пачатак—а 8 гадз. Каса—ад 6 гадз.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" ад аўторка, 2 ліпеня
2 падвойная грандыёзная праграма 2
баявікі—12 частак у кожны сэанс
1. Папул. нямецк. арт. Кармен Боні і Георг Александр у выключнай фільме ШЛЮБ ПАД ЗАКЛАД у 6 част.
2). Сусьветны комік Гарольд Лёйд у лепшай камэдыі сэзону УНУЧАК БАБКІ у 6 част.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увеч.
Каса адкрыта ад 5 з пал. гадз.

Кіно СПАРТАК
Выдатны амэрыканскі кіно-фільм
ад аўторка 2-га ліпеня РАБЫ АКІЯНУ
мастацкая драма ў 7 част.
Каса адкрыта ад 6 гадз. Пачат. сэансаў: 7 г. 30 м., 9 г., 11 гадз.

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя
ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ Натуральныя Мінэральныя Воды
НАРЗАН
ЭСЕНТУКІ № 20
Адзіныя сталовыя воды з натуральнай вуглякіслатой.
ЭСЕНТУКІ № 4
„ № 17
„ № 18
БАТАЛІНСКАЯ СЬМІРНОЎСКАЯ СЛАВЯНАЎСКАЯ
БАРЖОМ
Са складу 25 % адпускаюцца па гуртавых цэнах
з дармовай дастаўкай на дом.
Заказы вагонамі прымаюцца па зьніжаных цэнах і асобна ільготных умовах.
Патрабуйце ўсюды каўкаскія натуральныя мінэральныя воды!
Нарзан з кіёскаў прадаецца шклянкамі.
Раённы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 26-92, тэл. 374.

ТЭРМІНОВА ПАТРАБУЕЦЦА вольны ТРАКТАРЫСТЫ для працы на гусяніцным трактары «Клетрак»
Аб умовах працы даведацца пісьмова ці непасрэдна у Мэліярацыйнай Групы НКЗЭ—Менск, Савецкая, 70, 2-гі паверх.

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе дакумэнту

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА МОЛЬКА-САНІТАРН. Т-ВА
Ленінская (побач з 2-м Домам Саветаў), № 25, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 3 г. дня да 9 г. увеч
Прыём на ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраных, хірургічных, жаночых, зубных, вока, носа, вушэй, горла, носа і скуры
Фізіятрычны кабінэт: квары, электра і сьвета-лячэньне.
Рэнтгэнаўскі кабінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хваробы
Прыём хэміка-бактэрыял. аналізаў
Кансультацыя прафэсароў — прыём хворых па ленавых кніжках таварыстваў
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную плату.

АДПУСКНІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У —
кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск Галоўлітбел № 698.